

АБАРАНІЦЬ ГІСТАРЫЧНУЮ ПРАЎДУ

МС

АЎТАМАБІЛІ, ДАРОГІ, СПАДАРОЖНІКІ

МС





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 КАСТРЫЧНІКА 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 192 (29306)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Алег СЛІЖЭЎСКІ, міністр юстыцыі:**

*«Міністэрства юстыцыі пераглядзіць пералік дакументаў, неабходных для ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур праз службу «Адно акно». Плануецца правесці аналіз дакументаў, якія трэба прадстаўляць для кожнай з працэдур, каб захаваць толькі мінімальную іх колькасць і выключыць з пераліку тыя, без якіх працэдура можа быць выканана. Мінюст таксама працуе над арганізацыяй пакетнага прынцыпу ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур. Гэта дазволіць, напрыклад, пры звароце дзеля атрымання пасведчання аб нараджэнні дзіцяці адначасова стаць на ўлік для паляпшэння жыллёвых умоў, калі ўзнікае такое права, на чаргу ў дзіцячую дашкольную ўстанову».*

# ДАНІЛАЎНА-МАЙСТАР



Яе лялечны свет складаецца з капрону і сінтэпону. А яшчэ — з дроту, пэт-бутэлек, пенапласту, абрэзкаў тканін, гузікаў, спражак, стужак, раменчыкаў і ўсякай такой драбязы... Лялькі Таццяны ЦІХАНАВАЙ з Полацка — прыгожыя, пяшчотныя, з эмацыянальнымі тварыкамі, якіх так і хочацца прытуліць і якія быццам бы замерлі на паліцы ў чаканні нечага цудоўнага. Не верыцца, што ўсе яны зроблены з прамысловых адходаў. Ні больш ні менш — сапраўдныя творы мастацтва! Толькі рукі ўмелага майстра, калі яго душа сябруе з паэзіяй і казкай, могуць рабіць такія вытанчаныя і нібы адушаўлёныя цацкі... Таццяна Данілаўна ў адной асобе — і дызайнер, і скульптар, і швачка, і мадэльер. Сёння ў Полацкім гарадскім палацы культуры адкрываецца яе персанальная выстаўка. Напярэдадні падзеі я сустрэўся з Таццянай Данілаўнай і паслухаў цікавыя разважанні ў яе гасцінным доме. Напрыклад: «Зрабіць ляльку не так і лёгка, лёгка падарыць яе некаму — і гэта вялікая радасць для мяне».

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 1 кастрычніка правёў тэлефонныя размовы з кіраўнікамі Азербайджана Ільхамам Аліевым і Арменіі Ніколам Пашынянам. Галоўная тэма — сітуацыя ў Нагорным Карабаху.**

• У Нацыянальным аэрапорце Мінск прапануюць новае экспрэс-тэсціраванне на COVID-19. Галоўнай перавагай тэста з'яўляецца хуткасць выяўлення інфекцыі. Для атрымання выніку дастаткова 15—20 хвілін.

• **Сезон палявання на зайца адкрываецца 3 кастрычніка.**

• Стратэгію барацьбы з карупцыяй на 2021—2030 гады плануюць прыняць у Беларусі.

## Класныя навіны

# Партрэт настаўніка

### Справядлівы, талерантны, мудры, сучасны, іранічны, добры, артыстычны, усмешлівы, клапатлівы...



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

У ролі «вучняў» выступалі калегі-фіналісты, якія з вялікай ахвотай і гумарам падыгрывалі сваім больш удачлівым канкурэнтам.

**Чым педагог адрозніваецца ад іншых людзей? Ці лічыце вы найважнейшым паказчыкам якасці працы настаўніка ўзровень выступлення яго навучэнцаў на алімпіядах? Як вы разумееце выказванне Русо «Мастацтва выхавання заключаецца ў тым, каб не выхоўваць»? Арыстоцель сцвярджаў, што пазнанне пачынаецца са здзіўлення, а чым вы здзіўляеце сваіх вучняў? Ці патрэбна ўводзіць форменнае адзенне (дрэс-код) для педагогаў? Назавіце плюсы і мінусы дыстанцыйнага навучання... Што неабходна зрабіць, каб больш людзей размаўляла на беларускай мове? Што можа зрабіць школа для павышэння канкурэнтаздольнасці моладзі на рынку працы? Пытанні літаральна сыпаліся на галовы суперфіналістаў рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь — 2020», якія выступілі на сцэне Акадэміі паслядыпломнай адукацыі.**


СТАР. 4


## На слыху

# У РАМКАХ КЛІНІЧНЫХ ВЫПРАБАВАННЯЎ

### Першыя добраахвотнікі атрымалі прышчэпкі ад каранавіруса

**Учора ў Беларусі пачалося вакцынаванне добраахвотнікаў супраць каранавіруснай інфекцыі расійскай вакцынай «Спадарожнік V» у рамках клінічных выпрабаванняў. Двух першых пацыентаў прышчапілі ў 28-й паліклініцы Мінска. Беларусь стала першай краінай, дзе пройдуць выпрабаванні гэтай вакцыны пасля яе рэгістрацыі ў Расіі.**


СТАР. 3



ISSN 1990 - 763X
20192

# Інвестыцыі, якія вельмі дарэчы сёння

## «Эмаар Проперціз» рэалізуе ў Мінску праект «разумнага горада» на 4 млрд еўра

**Учора, 1 кастрычніка, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў з кіраўніком адной з найбуйнейшых у свеце дэвелаперскіх і інвестыцыйных кампаній — старшынёй савета дырэктараў «Эмаар Проперціз» Мухамедам Алі аль-Абарам рэалізацыю грандыёзнага праекта ў Беларусі.**

Гэта не першы візіт прадстаўніка дзелавога Дубая ў Мінск. Аляксандр Лукашэнка ўжо прымаў Мухамеда Алі аль-Абара ў Палацы Незалежнасці ў лістападзе мінулага года. Тады размова пра магчымыя інвестыцыі ў Беларусь вялася за закрытымі дзвярыма. Сёння ж будзе закладзена капсула ў падмурак аднаго з будучых будынкаў, што стане стартам стварэння «разумнага горада» на поўначы Мінска. Памер інвестыцый ААЭ ў нашу краіну перавысіць чатыры мільярды еўра.

«Прыкладна год таму, пры сустрэчы з вамі мы дамовіліся пра сумесную работу, — сказаў учора Прэзідэнт Мухамеду Алі аль-Абару. — Тады быў задуманы шэраг праектаў, якія вы ўзялі ў прапрацоўку і гатовыя былі ажыццявіць у Беларусі, пачынаючы ад сельскай гаспадаркі і заканчваючы будаўніцтвам буйных інфраструктурных праектаў. Мы дамаўляліся, што гэтай восенню, пасля прэзідэнцкіх выбараў, сустрэнемся і канчаткова расставім усе кропкі над «і».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што сустрэча адбываецца ў кантэксце няпростых часоў для ўсяго свету, выклікаў чалавецтву па многіх кірунках.

«За інвестара ў сувязі з гэтым ідзе вельмі вострая барацьба, і, вядома, ваша работа ў Беларусі, тыя інвестыцыі, якія вы плануеце ажыццявіць у Беларусь, нам вельмі дарэчы сёння», — адзначыў ён.

Кіраўнік беларускай дзяржавы выказаў гатоўнасць вырашыць усе праблемныя пытанні, якія ўзніклі ў сувязі з рэалізацыяй праекта.

Мухамед Алі аль-Абар у сваю чаргу павіншаваў Беларусь з тым, як краіна справілася са складанай эпідэміялагічнай сітуацыяй, маючы на ўвазе рашэнне не спыняць эканоміку.

«Спадар Прэзідэнт, я маю стасункі з прадстаўнікамі многіх краін. Нядаўна быў у Сербіі, і ў гэтай краіне самі кажуць, што тую шкоду, якую наносіць прастой эканомікі на месяц-паўтара, немагчыма выправіць», — патлумачыў ён сваю пазіцыю.

Другое віншаванне кіраўніка «Эмаар Проперціз» датычылася перамогі Аляксандра Лукашэнкі на прэзідэнцкіх выбарах.

«Мы ніколі не сумняваліся ў выніку, мы заўсёды цанілі палітыку, якую вы праводзіце, дасягненні вашай краіны ва ўзроўні жыцця насельніцтва, у бяспецы, па ўсіх параметрах», — сказаў ён.

### Да ведама

Кампанія «Эмаар Проперціз» — гэта дзяржаўнае акцыянернае таварыства Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў са штаб-кватэрай у горадзе Дубаі. Кампанія валодае больш чым 60 даччынымі кампаніямі і прысутнічае на рынках больш чым 35 краін на Блізкім Усходзе, у Паўночнай Афрыцы, Азіі, Еўропе і Паўночнай Амерыцы.

Кампаніяй рэалізаваныя найбуйнейшыя будаўнічыя праекты Дубая, у тым ліку самы высокі будынак у свеце «Бурдж-Халіфа» і адзін з найбуйнейшых у свеце гандлёва-забаўляльных цэнтраў «Дубай Мол». Цяпер рэалізуецца праект па будаўніцтве самага высокага збудавання, якое створана чалавекам, — «Дубай-Крык Таўэр», вышыня якога павінна скласці больш чым 900 метраў.

Па інфармацыі Bloomberg, даход кампаніі ў 2018 годзе склаў каля сямі мільярдаў долараў, актывы — больш за 30 мільярдаў долараў.

### У ТЭМУ

«У мяне тры асноўныя сферы, у якіх я працую: нерухомасць, рэстаранны бізнес і электронная камерцыя і тэхналогіі, — расказаў журналістам пасля сустрэчы з Прэзідэнтам Мухамед Алі аль-Абар. — У Беларусі асноўныя мае інвестыцыі будуць сканцэнтраваныя на сферы нерухомасці і інфраструктуры, вядзецца прапрацоўка таксама па шэрагу іншых кірункаў».

Паводле яго слоў, каля года ішла работа над пагадненнем з беларускім бокам па інвесціраванні ў развіццё паўночнай часткі Мінска.

«Мы плануем пабудаваць «разумны горад» у горадзе, — паведаміў старшыня савета дырэктараў «Эмаар Проперціз». — Ужо актыўна вядзём праектаванне. Інвестыцыі, якія мы плануем укласці ў гэты праект, перавышаюць чатыры мільярды еўра».

Мухамед Алі аль-Абар звярнуў увагу, што рэалізуе толькі буйныя праекты, размаітыя на колькасць ад 50 тысяч да 100 тысяч чалавек, і што праект у Мінску ён мае намер зрабіць самым лепшым, з улікам свайго багатага досведу.

«Размова не пра будынкі альбо інфраструктуру, якія будуць пабудаваныя, але пра якасць чалавечага жыцця. Мы хочам, каб гэты праект адбўся на сем'ях, дзецях, каб для іх былі створаны больш спрыяльныя ўмовы, каб развіваўся горад, паляпшаўся інвестыцыйны клімат, каб мясцовыя будаўнікі атрымалі самы сучасны вопыт, які яны змогуць выкарыстаць надалей, — дадаў ён. — Мы чакаем, што гэты праект дадасць 5-7 працэнтаў у ВУП Мінска і дазволіць стварыць больш за 70 тысяч працоўных месцаў».

Беларускі праект кампаніі «Эмаар Проперціз» «Паўночны бераг» прадугледжвае будаўніцтва Нацыянальнага выставачнага і Сусветнага гандлёвага цэнтраў, універсітэта, «гарадкоў» аховы здароўя і адукацыі, спартыўных аб'ектаў, гасцініц, паркавай зоны і іншага.

«Мы не глядзім на тое, каб зарабіць, мы глядзім больш шырока: каб рабіць жыццё людзей лепшым, — запэўніў старшыня савета дырэктараў «Эмаар Проперціз». — Мы хацелі б, каб праект у Беларусі быў адлюстраваннем нашага вопыту і майстэрства; каб тая архітэктура, якая будзе створана, радавала вока, была асаблівая, прывабная для публікі».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ЗНАЧНАЯ КОЛЬКАСЦЬ ІНТЭРНАТАЎ ПЕРАЖЫЛА ЭПІДЭМІЮ З НУЛЯВЫМ ІНФІЦЫРАВАННЕМ

**Больш за 80 работнікаў сацыяльнай службы ўзнагародзілі ў Мінску за дапамогу пажылым людзям у перыяд пандэміі COVID-19. Ім уручылі ганаровыя граматы і падзякі ад урада, Нацыянальнага сходу і Міністэрства працы і сацыяльнай абароны за добрасумленную працу, высокі прафесіяналізм і вялікі асабісты ўклад у работу па сацыяльнай падтрымцы грамадзян ва ўмовах дрэннай эпідэміялагічнай сітуацыі.**

— Наша краіна прадэманстравала ўсяму свету, як трэба клапаціцца пра людзей сталага веку, — сказаў **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.** — Дзяржаўная палітыка накіравана на сацыяльную абарону пажылых грамадзян.

Віцэ-прэм'ер адзначыў, што ўвесь свет гаворыць аб набліжэнні другой хвалі каранавіруса, але Беларусь усю неабходную медыцынскую дапамогу і работу органаў сацыяльнай падтрымкі арыентавалі не па «хвалях» захворвання, а па рэальным кантролі той абстаноўкі, якая складваецца з захворваннем у краіне.

Сацыяльная служба сёлета прыняла дадатковыя меры для абароны пажылых людзей і інвалідаў ад вірусных захворванняў. Пачынаючы з 20 сакавіка тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва арганізавалі дастаўку на дом прадуктаў харчавання, прадметаў першай неабходнасці і лекаў пажылым грамадзянам і інвалідам. Работа праводзілася ў цесным супрацоўніцтве з Беларускім таварыствам Чырвонага Крыжа, Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі і іншымі грамадскімі арганізацыямі. Адначасова тэрытарыяльныя цэнтры сістэмна працягнулі сацыяльнае абслугоўванне больш чым 95 тысяч непрацаздольных грамадзян.

**Міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ** адзначыла: адмысловая дапамога патрабавалася адзінокім пажылым людзям. ТЦСАН забяспечылі выкананне больш чым 30 тысяч заявак па дастаўцы прадуктаў харчавання на дом.

«Вядома, была вялікая дапамога з боку валанцёраў, але на перадавой сталі менавіта мы», — дадала яна.

Асаблівая ўвага аддаецца мерам супраць заносу каранавіруснай інфекцыі ў стацыянарныя ўстановы сацыяльнага абслугоўвання і яе распаўсюджвання там. У такіх установах пражывае амаль 21 тысяча пажылых людзей і інвалідаў. Там штодня кантралююць стан здароўя пражываючых і работнікаў. З улікам патрэбнасці сфарміраваны і падтрымліваецца месячны запас сродкаў індывідуальнай аховы і прафілактыкі, медыкаментаў і прадуктаў харчавання. З красавіка стацыянарныя ўстановы пачалі пераходзіць на вахтавы метад работы ў рэжыме поўнай ізаляцыі (14-дзённая работа персаналу без выхаду за межы ўстановы).

«Дамы-інтэрнаты для пажылых людзей і інвалідаў працавалі ў закрытым рэжыме больш чым чатыры месяцы, некаторыя дамы-інтэрнаты працягваюць так працаваць і зараз, зыходзячы з катэгорый работнікаў. Лічу, мы здалі гэты экзамен з мінімальнымі стратамі. Самае галоўнае, што ў нас ёсць значная колькасць інтэрнатаў, якія перажылі эпідэмію з нулявым інфіцыраваннем», — падкрэсліла міністр.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Ва ўрадзе

# НЕ ПРАГНОЗЫ, А МЭТЫ І СПОСАБЫ ІХ ДАСЯГНЕННЯ

**На Прэзідыуме Савета Міністраў разгледзелі асноўныя дакументы, якія датычацца сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў будучым годзе.**

## Рост ВУП запланаваны на ўзроўні 101,8 працэнта

«Зыходзячы з разлікаў, рост эканомікі ў наступным годзе запланаваны на ўзроўні 101,8 працэнта, — заявіў **прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА** на пасяджэнні Прэзідыума Саўміна. — Пры гэтым мы плануем захаваць ВУП бягучага года на ўзроўні 100 працэнтаў. І гэта пры тым, што многія развітыя краіны плануюць выйсці на дакрызісныя паказчыкі толькі ў 2022 годзе».

Датычна даклада міністра фінансаў аб бюджэце на наступны год прэм'ер заўважыў: «Ключавое патрабаванне да бюджэту — яго збалансаванасць і нацэленасць на вырашэнне сацыяльных задач і развіццё інфраструктуры. Бюджэт на будучы год — хачу, каб усе гэта разумелі, — фарміруецца ва ўмовах абмежаванасці рэсурсаў. Гэта бюджэт эпохі пандэміі і беспрэцэдэнтнага сусветнага крызісу».

Прамыя страты ад знешніх фактараў, на якія не можа ўплываць краіна, па словах Рамана Галоўчанкі, ацэньваюцца ў прыкладна 380 мільёнаў рублёў. На пагашэнне дзяржаўнага доўгу ў 2021 годзе будуць накіраваныя 4,9 мільярда рублёў, у тым ліку на пагашэнне знешняга дзяржаўнага доўгу — 4,2 мільярда, унутранага — 700 мільёнаў рублёў.

«Хачу адразу папярэдзіць каментарыі, якія часта гучаць у пэўных сродках масавай інфармацыі, маўляў, краіна ўпадзе пад даўгамі і гэтак далей: ніхто нікуды не ўпадзе, — спыніўся на гэтым моманце прэм'ер. — Сродкі гэтыя прадугледжаныя, краіна своечасова, як і заўсёды, разлічваецца з усімі даўгавымі абавязкамі без страты для выканання сваіх сацыяльных абавязацельстваў і мэт развіцця».

Раман Галоўчанка звярнуў увагу на тое, што работа над прагнознымі дакументамі распачалася тры месяцы таму, з канцэптуальнымі падыходамі да іх фарміравання ўрад пазнаёміўся на пасяджэнні Прэзідыума ў ліпені. Разам з тым за мінулыя некалькі тыдняў істотна змяніліся ацэнкі развіцця сусветнай эканомікі, краін — гандлёвых партнёраў Беларусі, цэн на кан'юнктурныя тавары, курсаў валют і захоўваюцца высокая валацільнасць і няпэўнасць іх дынамікі.

«Ключавыя параметры эфектыўнасці работы ўрада, якія будуць устаноўлены рашэннем кіраўніка дзяржавы, павінны адлюстроўваць не працэс, а мэту — павышэнне ўзроўню якасці жыцця насельніцтва, — запатрабаваў ён. — Не гнаць любой цаной валавыя паказчыкі, а працаваць над зніжэннем выдаткаў, павышэннем прадукцыйнасці і іншымі якаснымі паказчыкамі, якія павінны даць вынік у паляпшэнні фінансавага стану галін і арганізацый, росце даходаў працоўных, а за імі і іншых катэгорый грамадзян».

Прагноз будучага года, на думку кіраўніка ўрада, павінен быць максімальна рэалістычны з улікам рэсурсных магчымасцяў эканомікі, заснаваны на дакладных знешніх і ўнутраных умовах. Кароткатэрміновы перыяд аднаўлення росту не павінен парушаць дасягнутай макразбалансаванасці. Інтэграванымі паказчыкамі работы вертыкалі стануць эфектыўнасць гаспадарчай дзейнасці і прыбытак, адзначыў прэм'ер.

## Пяць ключавых задач

«Сёння Міністэрства эканомікі на разгляд Прэзідыума Савета Міністраў вынесла шэраг дакументаў, сярод іх — Мэтавы план развіцця эканомікі на 2021 год, — расказаў журналістам **міністр эканомікі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ.** — Гэта адмысловы дакумент, мы раней такі не распрацоўвалі: раней былі прагнозы, а на 2021 год мы вызначылі мэтавыя планы. Асаблівасць у дадзеным перыядзе ў тым, што галоўная мэта сёння — забяспечыць стабільны рост даходаў насельніцтва ў будучым годзе. Да таго ж нам неабходна аднавіць сектары эканомікі, якія пацярпелі, і забяспечыць аднаўленне эканамічнага росту. Нарэшце, важна аднавіць новы інвестыцыйны цыкл на пяцігадовы перыяд».

Для гэтага планам прадугледжваюцца, па словах міністра, пяць ключавых задач. Першая датычыцца росту даходаў і заробкаў, яна мае на ўвазе комплекс мер у рэальным сектары, бюджэтнай сферы, пенсійным забеспячэнні, так званай нізкааплатнай сферы. «Ключавой тут з'яўляецца ўвязка прадукцыйнасці працы з ростам заробкаў», — сказаў Аляксандр Чарвякоў.

Другая задача звязаная з актывізацыяй інвестыцыйнага цыклу. «Тут вельмі важна забяспечыць рост попыту на ўнутраным рынку, бо інвестары не ідуць на рынкі, якія падаюць, — адзначыў міністр эканомікі. — Вельмі важна таксама забяспечыць гарантыі інвестарам, зніжэнне іх рызыкі. Яшчэ адна ўмова — наяўнасць доўгіх і даступных рэсурсаў».

Трэцяя задача датычыцца росту экспарту. Аляксандр Чарвякоў запэўніў, што ў краіне ёсць рэсурсы для падтрымкі і стымулявання экспарцёраў.

Чацвёртая задача — павышэнне фінансавай устойлівасці дзяржаўных арганізацый. Пятая — развіццё рэгіёнаў, зніжэнне міжрэгіянальнай дыферэнцыяцыі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# У РАМКАХ КЛІНІЧНЫХ ВЫПРАБАВАННЯЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Клінічныя даследаванні пройдуць у васьмі медыцынскіх установах краіны. Сярод іх шэсць паліклінік Мінска — 1-я, 4-я, 5-я, 14-я, 19-я і 28-я, а таксама Мінская і Віцебская абласныя клінічныя бальніцы. У іх возьмуць удзел 100 добраахвотнікаў, якія не хварэлі раней на каранавірус.

Клінічныя выпрабаванні будуць уяўляць з сябе двайное сляпое рандамізаванае плацэба-кантраляванае даследаванне вакцыны «Спадарожнік V». Яна распрацавана ў Нацыянальным даследчым цэнтры эпідэміялогіі і мікрабіялогіі імя М. Ф. Гамалеі Міністэрства аховы здароўя Расіі. Фінансаванне гэтага праекта ў Беларусі ажыццяўляе Расійскі фонд прамых інвестыцый.

— Клінічнае выпрабаванне праходзіць у рамках асабістых дамоўленасцяў кіраўнікоў дзвюх краін, Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна, якія далі адпаведныя распараджэнні, — нагадаў **выконваючы абавязкі міністра аховы здароўя Беларусі Дзмітрый ПІНЕВІЧ.** — Урады нашых краін, міністэрствы аховы здароўя перайшлі да іх практычнай рэалізацыі. Любыя клінічныя выпрабаванні біялагічных прэпаратаў строга рэгламентаваныя. Нягледзячы на тое што наша дарожная карта была скарочаная па часе, яна была цалкам насычана мерапрыемствамі па бяспецы і выканана. І цяпер будуць зроблены першыя ін'екцыі нашым паддоследным.



**Спецыяліст па клінічных даследаваннях расійскай кампаніі «ІФАРМА», якая кантралюе ход выпрабаванняў, Сяргей ЧАРНЯК** дадаў, што добраахвотнікамі сталі адносна здаровыя людзі. Яны могуць мець некаторыя хранічныя захворванні, але не ў фазе абвастрэння. Гэта мужчыны і жанчыны ва ўзросце ад 18 да 60 гадоў.

Адным з такіх добраахвотнікаў, які атрымаў прышчэпку, стаў мінчанін Андрэй Мятліцкі. Пра выпрабаванні ён даведаўся са СМІ, затым знайшоў неабходную інфармацыю на сайце Міністэрства аховы здароўя.

— Патэлефанаваў у паліклініку, пацікавіўся, ці можна стаць валанцёрам. Запісаўся, і мяне адабралі ў лік паддоследных. Я заўсёды раблю прышчэпкі і асабіста не хварэю. Мяркую, гэта вакцына абароніць мяне і маіх блізкіх ад каранавіруса, — падзяліўся мінчанін.

Праз гадзіну пасля прышчэпкі пацыент можа пакінуць паліклініку.

— Як і пры вакцынацыі ад грыпу, у чалавека могуць назірацца нязначнае павышэнне тэмпературы, лакальныя гіпертэрмічныя рэакцыі, — удакладніў Сяргей Чарняк.

За добраахвотнікамі, якія атрымалі прышчэпку, урачы-даследчыкі будуць назіраць у першыя, сёмыя і чатырнаццатыя суткі. Гэта будуць як візіты дадому, так і тэлефонны кантроль. Праз 120-180 дзён стане зразумела, атрымаў чалавек вакцыну або плацэба. І толькі праз 180 дзён можна будзе канчаткова пацвердзіць бяспеку вакцыны.

Арганізатар даследавання правёў маніторынг ва ўсіх медустановах, у якіх пройдуць выпрабаванні, і яны атрымалі статус даследчых цэнтраў. Усюды праведзена навучанне спецыялістаў.

— Наша паліклініка адпавядае крытэрыям для правядзення клінічных выпрабаванняў, і мы маем сертыфікат. Спадзяюся, што паспяхова правядзём гэта даследаванне і краіны атрымаюць эфектыўны прэпарат для барацьбы з гэтай небяспечнай інфекцыяй, — адзначыла **галоўны ўрач 28-й паліклінікі Ларыса КАЗАК.**

Як удакладніў Дзмітрый Піневіч, ужо больш як 4 тысячы беларусаў выказала жаданне прыняць удзел у вакцынацыі.

**Алена КРАВЕЦ.**

## Слова чытачам

### «ЗВЯЗДЗЕ» МОЖНА І НАВАТ ПАТРЭБНА ДАВЯРАЦЬ



**Дзяніс МУЖЖУХІН, дырэктар Нацыянальнага антыдопінгавага агенцтва:**

— Газета, якая выходзіць больш за сто гадоў, адназначна, дакладна ведае, што хвалюе беларусаў. Таму матэрыялам «Звязды» можна і нават патрэбна давяраць. Журналісты гэтага выдання не раз пацвярджалі свой прафесіяналізм. Асабіста мне імпануе, што матэрыялы газеты заўсёды датычацца інтарэсаў розных людзей: спорт, культура, сацыяльныя праблемы, міжнародныя навіны. Вельмі важна, што газета не засяроджваецца на чымсьці адным, а дае сваім чытачам разнапланавую карціну. Гэта дазваляе з кожным нумарам даведвацца пра нешта новае і цікавае. Так неназойліва, але паспяхова «Звязда» дапамагае развівацца сваім чытачам.

У нашай краіне шмат увагі аддаецца спорту і яго праблемам. Інфармацыйная падтрымка мае вялікае значэнне ў пашырэнні спартыўнай дзейнасці. Дзякуй «Звяздзе» за тое, што яна прафесійна і цікава асвятляе ўсё, што звязана са спортам. Людзі пачынаюць больш цікавіцца спортам, здаровым ладам жыцця, што ідзе на карысць грамадству.

Я жадаю «Звяздзе» журналісцкіх поспехаў, плённай працы і чытачоў, якія заўсёды будуць падпісвацца на газету. Як кажуць у спорце, — хутчэй, вышэй, мацней!

## Блізкая ўлада

### ТЭЛЕФАНУЙЦЕ — ВАС ПАЧУЮЦЬ

**Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі з мэтай павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, папяротворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 3 кастрычніка, з 9.00 да 12.00 праводзяць:

✓ намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

✓ намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;

✓ намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;

✓ намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Францавіч ПРАНЮК. Тэл. 8 015 273 56 44;

✓ намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. 8 022 250 18 69;

✓ першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Сяргей Віктаравіч ЛЯЎКОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

✓ старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Яўгеневіч КУХАРАЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні першаму намесніку рэдактара газеты «Звязда» Наталлі Уладзіміраўне Карпенцы з прычыны напаткаўшага яе вялікага гора — смерці БАЦЬКІ.**

## Радзімазнаўства

### АСТРАМЕЧАВА МАЕ СВОЙ ЛЕТАПІС

**У чарговым нумары — трэцім за 2020 год — брэсцкага краязнаўчага альманаха доктар філалагічных навук, кіраўнік лабараторыі «Фальклярыстыка і краязнаўства» Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна Іна ШВЕД нагадвае пра тое, што калядныя і валачобныя песні з'яўляюцца ідэальнай мадэллю багатай гаспадаркі (артыкул «Така біла вэлыка свынка ідэ за мною...»: вобраз свінні ў фальклоры Берасцейшчыны»). Часам і смешна чытаючы многія цытаты, а часам за імі і жыццё адразу відаць у самых розных праявах. Простае, сялянскае жыццё, якое і сёння патрабуе працавітасці, руплівасці, дбання ў гаспадарчых справах.**




— Мы і альманах свой пры падтрымцы мясцовых улад з гэтай мэтай задумалі, каб сапраўднае жыццё праз краязнаўства, гістарычныя, фальклорныя, этнаграфічныя вышукі разгледзець, — дзеліцца развагамі **рэдактар і ўкладальнік «Астрамечаўскага рукапісу» член Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандр ВАЛКОВІЧ.**

Нагадаем, што ў рэдакцыйную калегію выдання ўваходзяць вучоныя, літаратары не толькі з Брэста, але і з Мінска таксама. А навуковымі кансультантамі альманаха з'яўляюцца адразу два дактары філалагічных навук — Адам Мальдзіс і Іна Швед.

У свежым выпуску «Астрамечаўскага рукапісу» артыкулы, нарысы, карэспандэнцыі краязнаўчага, гістарычнага, літаратурна-мастацкага характару змешчаны ў традыцыйных рубрыках: «Астрамечава і астрамечаўцы», «Народныя святы і звычаі Берасцейшчыны», «Скарбніца народных талентаў», «Літаратурная сядзіба», «Кніжная зала», «Калаўрот культурнага жыцця», «Старонкі гісторыі», «Беларусь памятае». Па традыцыі выданне багата ілюстраванае. У тым ліку — і архіўнымі, старымі фотаздымкамі.

**Мікола РАЎНАПОЛЬСКІ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ЕС падае ў суд на Вялікабрытанію



Еўрапейскі саюз запусціў працэс судовага разбору супраць Вялікабрытаніі, паведаміў Euronews. ЕС адправіў уладам Злучанага Каралеўства афіцыйнае паведамленне аб парушэнні краінай пагаднення аб выхадзе са складу супольнасці. Як заявіла на прэс-канферэнцыі ў Бруселі кіраўнік Еўракамісіі Урсула фон дэр Ляен, такія дзеянні звязаны з брытанскім законапраектам аб унутраным рынку, які супярэчыць умовам здзелкі. «Як вы ведаеце, мы заклікалі Вялікабрытанію да канца верасня ліквідаваць парушэнні ў законапраекце. Біль прайшоў у тым жа выглядзе, парушэнні не былі ліквідаваны. Таму Еўракамісія вырашыла даслаць афіцыйнае паведамленне, якое з'яўляецца першым крокам працэдуры ліквідацыі парушэнняў», — адзначыла Урсула фон дэр Ляен і падкрэсліла, што ў Лондана ёсць адзін месяц на адказ.

### Новы ўрад Бельгіі прыведзены да прысягі



Новы федэральны ўрад Бельгіі на чале з прэм'ер-міністрам Аляксандрам дэ Кроо прыведзены да прысягі. Пра гэта паведаміла нацыянальнае агенцтва Belga. Новая кіруючая кааліцыя ўключае сем партый усіх палітычных кірункаў — ад сацыялістаў да лібералаў, ва ўрад увайшлі 15 міністраў і пяць дзяржсакратароў, кіраўніком МЗС прызначана экс-прэм'ер колішняга тэхнічнага кабінета Сафі Вільмес. Новы склад новай кааліцыі ўжо атрымаў мянушку «Вівальдзі» — па знакамітым струнным канцэрце «Поры года». Гэта тлумачыцца тым, што ў кааліцыю ўвайшлі партыі з абодвух рэгіёнаў Бельгіі і ўсіх чатырох сегментаў палітычнага спектра, з якімі ў мясцовай палітычнай практыцы асацыяваныя канкрэтныя колеры. Бельгійскі крызіс мог бы працягнуцца і даўжэй, аднак, паводле інфармацыі крыніц ТАСС у Бруселі і Антверпене, нефармальны ціск на палітычныя колы краіны пачаў аказваць былы прэм'ер, а цяпер кіраўнік Еўрапейскага савета Шарль Мішэль. Ён патрабаваў, каб Бельгія атрымала паўнавартасны ўрад да саміту кіраўнікоў і ўрадаў ЕС 1—2 кастрычніка, на якім, у прыватнасці, будуць абмяркоўвацца фінансавыя праграмы аднаўлення эканомікі ЕС пасля пандэміі, для зацвярджэння якіх паўнамоцтваў тэхнічнага ўрада недастаткова.

### Пад партрэтам Моны Лізы знойдзены схаваны малюнак

Французскі вучоны Паскаль Кот паведаміў, што выявіў пад партрэтам Моны Лізы работы Леанарда да Вінчы (таксама вядомым як «Джаконда») схаваны малюнак, пра які раней не было вядома. Выкарыстоўваючы апаратуру ўласнай вытворчасці, Кот, як сцвярджаецца ў даследаванні, апублікаваным у часопісе Journal of Cultural Heritage, знайшоў сляды эскіза, які быў зроблены ў тэхніцы спальвера. Гэта значыць, што Леанарда да Вінчы перанёс малюнак на драўляную панэль вугалем праз адтуліны, праведзеныя ў лініях эскіза — як па трафарэце. Сляды вугалю Кот выявіў каля рукі і лініі валасоў на галаве Моны Лізы. Ён таксама лічыць, што мастак у працэсе стварэння карціны змяніў позу сваёй гераіні, павярнуўшы яе галаву непасрэдна ў бок гледача.

# Партрэт настаўніка

## Медыяадукацыя і крытычнае мысленне

Першае выпрабаванне суперфіналу ўяўляла сабой «прэс-канферэнцыю» з пытанняў і адказаў: на роздум удзельнікам давалася 30 секундаў. Насамрэч, палова хвіліны для настаўніка — сапраўдная раскоша. Яго рэакцыя павінна быць імгненная, бо нестандартныя педагагічныя сітуацыі — зусім не рэдкасць.

Але пра ўсё па парадку. Нагадаем, што суперфіналу конкурсу прафесійнага майстэрства педагогаў папярэднічаў фінал, у якім павінны былі ўдзельнічаць 56 найлепшых настаўнікаў з усёй краіны — пераможцаў абласнога і мінскага гарадскога этапаў рэспубліканскага конкурсу ў васьмі намінацыях (на жаль, некаторыя сышлі з дыстанцыі з прычыны хваробы). А ў суперфінал выйшлі толькі восем найлепшых, якія перамаглі ў фінальнай частцы спаборніцтваў: кожны ў сваёй намінацыі.

За спінай ва ўсіх удзельнікаў былі два ўрокі, праведзеныя ў незнаёмай дзіцячай аўдыторыі (у тым ліку па тэме, якую журы агучыла напярэдадні выпрабавання), псіхалагічнае і педагагічнае тэсціраванне і майстар-класы для будучых калег — студэнтаў педагагічных спецыяльнасцяў. Калі ў фінале мужчын-педагогаў было чатырнаццаць, у суперфінале іх засталося двое.



«Навошта вучыць замежную мову?»
На сцэне — настаўніца нямецкай мовы Вольга ТРУХАН.

За званне найлепшага ў прафесіі змагаліся настаўніца матэматыкі сярэдняй школы № 31 г. Віцебска **Наталля ШЧАГЛОВА,** настаўніца нямецкай мовы сярэдняй школы № 3 г. Орша **Вольга ТРУХАН**, настаўнік рускай мовы і літаратуры Маладзечанскай сярэдняй школы № 1 імя Янкі Купалы **Васіль МАЛІНОЎСКІ**, настаўніца пачатковых класаў гімназіі № 1 г. Свіслач **Людміла ПАБУДЗЕЙ**, настаўнік геаграфіі сярэдняй школы № 19 г. Гомеля **Вадзім ЛОСЕЎ**, настаўніца біялогіі сярэдняй школы № 8 г. Гомеля **Марына КАПЦЭВІЧ**, настаўніца музыкі Гродзенскай гарадской гімназіі **Святлана АДАМЧУК** і выхавальніца дашкольнага цэнтра развіцця дзіцяці «Сонейка» г. Слуцка **Вікторыя ГЯЧ**. У самых «маладых» (настаўнікаў нямецкай мовы і геаграфіі) стаж педагагічнай дзейнасці — сем гадоў, а ў самага сталага педагога (настаўніцы музыкі) — дваццаць пяць.

Рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства педагогаў праводзіцца ў нашай краіне раз у тры гады. Старшыня журы суперфіналу, рэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта, доктар педагагічных навук, прафесар **Аляксандр ЖУК** лічыць, што часцей не трэба — паўза павінна быць найперш для таго, каб асэнсаваць прадстаўлены калегамі досвед.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

З чым жа прыйшлі ў фінал канкурсанты? Медыяадукацыя, прыёмы развіцця крытычнага і крэатыўнага мыслення, праблемныя сітуацыі для стымулявання творчых здольнасцяў, інтэлектуальныя гульні для павышэння пазнавальнай актыўнасці, «сінгапурская методыка» для навыкаў самакантролю і самаацэнкі, перакулены клас, скрайбінг, скетчноўтынг, новыя падыходы да фарміравання матывацыі, адукацыйнае асяроддзе Lego, квэсты адукацыйнай накіраванасці — вось далёка не поўны пералік метадаў, прыёмаў і тэхналогій, прадэманстраваных фіналістамі.

## Педагог і пчала. Што іх аб'ядноўвае?

Сапраўдным святам у суперфінале стаў 20-хвілінны ўрок на сцэне. Усім удзельнікам напярэдадні была прапанавана адна і тая ж тэма «Для чаго трэба вывучаць?..» Раскрыць яе неабходна было сродкамі свайго прадмета. На ўроку музыкі ўсе шукалі адказ на пытанне пра ролю музыкі ў нашым жыцці, а зала ахвотна дапамагала з... аркестрам папяровых інструментаў. На ўроку нямецкай мовы вучылі замежныя словы і пранікаліся іншамоўнай культурай. На ўроку матэматыкі — складалі формулу паспяховай асобы. Між іншым, у ролі «вучняў» выступалі калегі-фіналісты, якія хоць і выбылі з барацьбы, але з вялікай ахвотай і гумарам падыгрывалі сваім больш удачлівым канкурэнтам.



На ўроку ў Наталлі ШЧАГЛОВАЙ «вучні» стваралі формулу паспяховай асобы.

А на ўроку геаграфіі ўсе «вучні» адправіліся ў віртуальнае падарожжа разам са сваім педагогам. Несумненна, гэты прадмет найлепш вывучаць у вандроўках. «Самалёт», які пілатаваў **Вадзім ЛОСЕЎ**, «прызямліўся» ў Расіі. Самае глыбокае возера на планеце (Байкал) знаходзіцца на тэрыторыі гэтай краіны, як і самы высокі вулкан у Еўразіі (Ключаўская сопка). Затым на «цягніку» ўсе «адправіліся» ў суседнюю Украіну, каб прайсціся па вулачках яе гарадоў.

— А ці ведаеце вы, што насельніцтва Кіева ў XI стагоддзі па колькасці перавышала насельніцтва Парыжа ў 50 разоў, а насельніцтва Лондана ў 10 разоў? А ці вядомы вам наступны факт: у Львове кожны пяты жыхар — студэнт, таму што ў горадзе размяшчаецца 26 вышэйшых навучальных устаноў, — цікавіўся ў сваіх «выхаванцаў» педагог, а паралельна паспяваў яшчэ і кантактаваць з глядацкай залай, задаваць пытанні і жартаваць. — У гасцях добра, але дома лепш. Вяртаемся дамоў пешшу (цягнікі не ходзяць), праз палескія балоты, якія называюць «лёгкімі Еўропы», бо яны выпрацоўваюць 50 працэнтаў усяго кіслароду на еўрапейскім кантыненце (усе на сцэне дэманструюць, як яны прабіраюцца праз дрыгву пад смех і жарты ў зале. — **Аўт.**). Вось мы і дабраліся да майго любімага Гомеля. Менавіта тут у Беларусі нарадзіўся інтэлектуальны рух «Што? Дзе? Калі?», дзякуючы Леаніду Клімовічу быў створаны клуб «Белая рысь». А давайце пагуляем у «Што? Дзе? Калі?» Што ў мяне ў чорнай скрыні? Старажытнагрэчаскі філасоф Эмпедокл адкрыў яго, назіраючы за пасудзінай, апушчанай у ваду. Нямецкі фізік, інжынер і філасоф Ота фон Герыке вывучаў яго ўласцівасці, а Гётэ параўноўваў з ім каханне. Яшчэ не здагадаліся? У скрыні чыстае гомельскае паветра...»

— Як вы думаеце, што аб'ядноўвае настаўніка і пчалу? — запыталася ў сваіх «вучняў» біёлаг **Марына КАПЦЭВІЧ**. — Так, высокая прадукцыйнасць, камунікатыўнасць, працалюбства і здольнасць да супрацоўніцтва. А ці ведаеце вы, што адзін вулей за год вырабляе 150 кілаграмаў мёду? А як вы думаеце, колькі вучнёўскіх сшыткаў прыносіць за год дадому настаўнік? Да 150 кілаграмаў!!! Праца ўсіх нас прыводзіць да нейкага выніку. Прадукт працалюбства пчол — мёд, а настаўніцкі прадукт — гэта веды.

Пад кіраўніцтвам Марыны Капцэвіч педагогі выконвалі на сцэне танец пчалы, з дапамогай якога гэтыя насякомыя камунікуюць паміж сабой. За адкрыццё «мовы пчол» Карл Рытэр фон Фрыш атрымаў у 1973 годзе Нобелеўскую прэмію ў вобласці фізіялогіі і медыцыны. Танец атрымаўся на «дзясятачку»!

«Навошта вывучаць славеснасць?» Так сфармуляваў тэму свайго ўрока настаўнік рускай мовы і літаратуры **Васіль МАЛІНОЎСКІ**: «Апокрифы, жития, летописные своды, поучения, хождения... Будет ли это все востребовано в мире сторителлинга, копирайтинга, фристайла и серфинга?» У медыяхолдынг паступілі тры кантракты на рэкламу. Адной групе было даручана распрацаваць рэкламу анлайн-курсаў у стылістыцы настаўленняў Уладзіміра Манамаха, другой — прадумаць маркетынг падручніка ў духу авантурнага рамана, а праект па літаратурным турызме трэба было аформіць у жанры хаджэнняў, дзе павінны былі быць факты, алегорыі і добрая «ўпакоўка».

## Вучыць уменню вучыцца

«Настаўнік (выхавацель) учора, сёння заўтра» — так арганізатары конкурсу сфармулявалі тэму для публічнага выступлення ўсіх суперфіналістаў.

— Кажуць, не мы выбіраем дарогі, а яны нас, але настаўніцкую дарогу людзі выбіраюць самі, — разважала настаўніца нямецкай мовы **Вольга ТРУХАН**. — Мой першы год працы быў годам узрушэнняў, адкрыццяў і зрэдку расчараванняў. Чалавек вучыцца толькі ў таго, каго любіць. Я — настаўнік, і гэта на мяне кожны дзень глядзяць вочы маіх вучняў. Настаўнік сёння не той, хто толькі вучыць, а той, хто вучыцца кожны дзень сам, і ў гэтым мне дапамагаюць мае вучні. Дзеці ўмеюць вучыць лепш за дарослых, таму што яны дзейнічаюць і кажуць адкрыта. Кожны дзень я вучуся спецыяльна і выпадкова: жыццёвыя сітуацыі, кнігі, вандроўкі даюць мне магчымасць зразумець, хто я. Я вучуся вучыць кожны дзень. Я вучуся вучыць маіх дзяцей уменню вучыцца. Мэта школы — забяспечыць якасную адукацыю, але **сёння намнога больш важна, чым настаўнік напоўніць душу вучня,** таму на сваіх уроках я вучу паважаць чужую культуру і любіць сваю Радзіму, знаходжуся ў пастаянным творчым пошуку, няспынным развіцці, удасканаленні сваіх педагагічных здольнасцяў. Педагагічны вопыт у мяне яшчэ не вельмі вялікі, але гэта толькі пачатак. Мы ўсе, настаўнікі, — учора, сёння, заўтра — будуем школу будучыні.


Вадзім ЛОСЕЎ: «Яшчэ не здагадаліся? У скрыні чыстае гомельскае паветра...»

— Справядліва кажуць, што пісьменнік жыве ў сваіх творах, мастак — у карцінах, а настаўнік? Я належу да пакалення 90-х, а мае вучні — пакаленне XXI стагоддзя. Дзеці, якія прыйшлі ў першы клас у 2020 годзе, працягнуць сваю прафесійную дзейнасць да 2080 года. Якім будзе свет напрыканцы XXI стагоддзя, цяжка ўявіць, пры гэтым настаўнік будучыні, абапіраючыся на вопыт мінулага, павінен апярэджваць час, — лічыць Васіль Маліноўскі. — Жыццё ў сучасным свеце з кожным днём паскараецца. Але будучыня — гэта не толькі палёты ў космас, IT-тэхналогіі, робаты... Будучыня — гэта нашы вучні, і ад настаўніка залежыць, якія кнігі яны будуць чытаць, якімі людзьмі яны стануць... **Узнятая рука на ўроку — гэта не толькі сігнал «я ведаю», але і «можна я паспрабую?».**

Прызначэнне настаўніка не змяняецца. Настаўнік заўтра — гэта настаўнік-майстар, як учора і сёння: строгі і справядлівы, патрабавальны і талерантны, мудры, сучасны, іранічны, добры, артыстычны, усмешлівы, клапатлівы, той, хто суперажывае і сумняваецца. Я шчаслівы ў сваёй прафесіі. Гэта маё прызванне, мой лад жыцця і гэта застаецца нязменным: учора, сёння і заўтра.

## Не карміце дыверсанта!

— Я раскажу гісторыю, якая здарылася ў маім 6 «Б». Вучаніца падняла руку і пытаецца: «Вадзім Алегавіч, вы такі разумны, такі цікавы чалавек, чаму вы настаўнік?» Я зразумеў, чаму яна так спытала. Таму, што паспяховасць вучня вызначаецца паспяховасцю настаўніка, а паспяховасць настаўніка вызначаецца толькі ім самім, — кажа **Вадзім ЛОСЕЎ**. — Паважаныя калегі, я хацеў бы, каб у гэтай зале і ў гэтым свеце ніхто і ніколі не ставіў пад сумненне ўпэўненасць у сабе. Не давайце нікому карміць вашага ўнутранага дыверсанта! Заўсёды будзьце ў гармоніі з сабой, любіце і прымайце сябе. У кнізе Барыса Акуніна «Азазэль» галоўная гераіня лэдзі Эстэр стварыла цэлую сетку эстэрнатаў па ўсім свеце, укараніла на ўсе галіны сваіх «азазэлей» — у міністэрствы замежных спраў, культуры, адукацыі, спорту. І праз нябачныя ніці кіравала сваёй імперыяй. Мы з вамі нясём вялікую адказнасць за тое, што робім. Мы кіруем цэлай краінай, кіруем людзьмі. Адказваем за ўсё, што мы кажам і што транслюем. Паверыўшы нам аднойчы, дзеці вераць нам усё астатняе жыццё.

Разважаючы над філасофскім пытаннем аб ролі настаўніка ва ўсе часы, **Людміла ПАБУДЗЕЙ** зазначыла: «Прафесія настаўніка — гэта вечнае выпрабаванне мудрасці, цярплівасці, прафесійных якасцяў і нестандартнасці, але галоўным індыкатарам нашай працы былі, ёсць і будуць дзеці. Гэта такі шумны, стракаты кругаварот, які проста зацягвае цябе ў самую гушчу падзей. Вось падбегла Насця: «Людміла Анатольеўна, а вы глядзелі новы фільм? Не? Абавязкова паглядзіце». І я, канешне ж, буду глядзець гэты фільм, бо мне цікава, што яе ўсхвалявала і зачапіла. Гераіня маёй любімай казкі Льюіса Кэрала Аліса кажа: «Трэба бегчы з усіх ног, каб толькі заставацца на месцы, а каб кудысьці трапіць, трэба бегчы як мінімум удвая хутчэй!». Разуменне гэтага прымушае мяне спяшацца пазнаваць новае і бегчы, бегчы, бегчы... да класа. Стоп! Адкрывай дзверы і заходзь. Што ты бачыш? Вочы? Правільна! Ты на сваім месцы!

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

**Імя пераможцы рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь — 2020» аб'явяць сёння ўвечары, падчас урачыстасцяў, якія пройдуць у Палацы Рэспублікі з нагоды прафесійнага свята ўсіх педагогаў. Ён атрымае таксама і ключы ад новенькага аўтамабіля «Geely».**

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

2 кастрычніка 2020 г. № 37 (573)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


СПЕЦВЫПУСК

# ПЛЁН НАСУПЕРАК АБСТАВІНАМ

## Пра што ішла размова на пленарным пасяджэнні саміту











Фота Яна ХВЕДЧЫНА і з сайта Савета Федэрацыі Расіі.

**VII Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі завяршыўся, але сапраўдныя яго вынікі — тое, што забяспечыць падпісанне заключаных на яго палях кантрактаў, — наперадзе. Новыя вытворчасці, прадукцыя, рабочыя месцы і заробкі. Пакуль мы ведаем лічбу 750 мільёнаў долараў — на такую суму былі падпісаныя дзелавыя паперы паміж прадстаўнікамі бізнесу дзвюх краін. Але гэтая лічба — толькі арыенцір, які кажа нам пра тое, што, нягледзячы на ўсе складанасці 2020 года, гэты форум аказаўся самым плённым з усіх праведзеных. Сумарны вынік шасці папярэдніх форумаў — два мільярды долараў. У верасні гэта года, на фоне дыстанцыйных размоў, медыцынскіх масак і трывожных навін, прырост — амаль на 40 працэнтаў. «Добры рывок наперад», — падсумаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

Такі плён у значнай ступені забяспечыла сустрэча кіраўнікоў дзвюх дзяржаў напярэдадні форуму. Абодва ў сваіх відэазваротах падчас пленарнага пасяджэння казалі аб тым, што ў верасні ў Сочы дамовіліся актывізаваць рэгіянальнае супрацоўніцтва. Напярэдадні, падчас і адразу пасля завяршэння саміту, Прэзідэнт Беларусі асабіста сустрэўся з лідарамі сямі рэгіёнаў Расіі. Такія сустрэчы не былі нечым незвычайным. Прамым сувязям паміж прадпрыемствамі, бізнесменамі і кіраўнікамі Аляксандр Лукашэнка заўсёды надаваў вялікае значэнне і ва ўсе часы свайго прэзідэнцтва гэтаму садзейнічаў. З некаторымі, як, напрыклад, з Алегам Кажамякам, які зараз узначальвае ў Расіі Прыморскі край, а да гэтага кіраваў Сахалінскай вобласцю, усталяваліся сяброўскія адносіны.

Відавочна, што эфект сёлетняга саміту забяспечыў і закладзены ў ранейшыя гады падмурак. Да адметнасцяў VII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі трэба дадаць фармат відэаканферэнцый і, вядома, тэму: «Гістарычная спадчына Вялікай Перамогі як аснова развіцця сацыяльна-эканамічных і духоўных сувязяў народаў Беларусі і Расіі».

### Змаганне ў чацвёртым асяроддзі

«На жаль, сёння робяцца спробы перагляду, рэвізіянізму, фальсіфікацыі гісторыі і вынікаў Другой сусветнай вайны, — адзначыў на пленарным пасяджэнні VII Форуму рэгіёнаў **прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА.** — Знаходзяцца ахвотныя перарабіць і падзяліць сучасны свет па-новаму, пасеяць узаемны недавер, варожасць, раз'яднаць людзей. Супраць Беларусі і Расіі вядуцца лютыя інфармацыйныя атакі, нас, нашчадкаў герояў-пераможцаў, хочуць прымусіць адчуваць віну, ледзь не апраўдвацца за сваіх бацькоў і дзядоў, якія цаной уласнага жыцця забяспечылі мір для чалавецтва».

На думку прэм'ер-міністра, такія нападыі — «частка спланаванай палітыкі не проста па рэвізіі гістарычнай памяці, а па злому калектыўнай ментальнасці народаў».

«Савецкі Саюз вінавацяць у развязванні Другой сусветнай вайны, савецкія сімвалы прывязваюць да нацысцкіх, людзям забараняюць адзначаць свяшчэнныя для іх святы пад сцягамі Вялікай Перамогі. Для чаго гэта робіцца? Каб разбурыць памяць, зламаць унутраны стрыжань, а затым з дапамогай разладу і хаосу паставіць, магчыма, пад вонкавае кіраванне нашы краіны», — лічыць кіраўнік беларускага ўрада.

Раман Галоўчанка гаварыў пра неабходнасць актывізаваць сумесную дзейнасць па цэлым спектры кірункаў — у палітыцы, эканоміцы, сацыяльнай сферы, адукацыі і культуры. На яго думку, актуальнае захаванне гістарычнай спадчыны, супрацьдзеянне інфармацыйным войнам, удасканаленне работы ў медыйнай прасторы, развіццё і ўмацаванне эканамічнага супрацоўніцтва на раўнапраўнай аснове.

«Мы высока цэнім падтрымку брацкай Расіі і глыбока ўдзячныя за гэта. Беларусь заўсёды была і будзе вашым надзейным сябрам і партнёрам», — запэўніў прэм'ер-міністр расіян.

стар. 2

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### Мода на «інтэграцыю ў горад»




**Як справіцца з яе наступствамі, высвятлялі ўдзельнікі тэматычнай секцыі ў Дзяржынскім раёне.** стар. 4

### Артэфакты Перамогі



**Выстаўку рарытэтаў, інтэрактыўных праектаў і цікавых ініцыятыў зладзілі ў НАН Беларусі.** стар. 14

### 61 мільён долараў




**Ці самы вялікі кантракт? Арганізацыі нафтахімічнага профілю традыцыйна актыўныя ў перыяд правядзення Форуму рэгіёнаў.** стар. 14

### Праз усю Беларусь!



**Рэспубліканскі аўтапрабег ад усходняй мяжы да заходняй адбудзецца ў суботу, 3 кастрычніка.** стар. 16

### Насустрач будучыні, якую мы хочам



**У Мінску прайшоў медыяфестываль «Галасы маладых за ўстойлівае развіццё — 2020».** стар. 16

# ПЛЁН НАСУПЕРАК АБСТАВІНАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

«Шмат каму не падабаецца самастойнасць Беларусі. Нас разгойдвалі не год і не два, спрабавалі на зуб, ужывалі самыя розныя методыкі «каляровых рэвалюцый». Беларусь сутыкнулася не проста з ціскам — па сутнасці, са спробамі знутры падарваць наша грамадства», — адзначыў Раман Галоўчанка.

Паводле яго слоў, пакуль асноўнае проціборства ідзе ў інфармацыйнай прасторы, якое па ступені ўплыву на грамадства стала чацвёртым баявым асяроддзем разам з зямлёй, вадой і паветрам.

Кіраўнік беларускага ўрада лічыць, што ідзе маніпуляцыя масавай свядомасцю, ствараюцца фэйкавыя паведамленні, якія ўтрымліваюць адкрытую хлусню і правакацыю. «Менавіта з гэтага пачынаюцца сацыяльныя катаклізмы ў сучаснасці. У выніку пакутуюць мільёны людзей, мяняецца палітычная карта свету, адсоўваюцца на другі план агульнапрынятыя нормы маралі, маральнасці, агульначалавечыя каштоўнасці», — падкрэсліў Раман Галоўчанка.

На думку прэм'ер-міністра, пад інфармацыйны прэсінг у першую чаргу трапляюць маладыя людзі.

«Шмат у чым ад нас залежыць, ці засвояць яны традыцыйныя і стваральныя каштоўнасці, ці не здрадзяць памяці пакаленняў і ці змогуць правільна арыентавацца ў сваім жыцці. Бо менавіта ім мы павінны перадаць нашы краіны, нашу Саюзную дзяржаву, перадаць мір, парадак і спакой, традыцыі і ідэалы, прыхільнасць да дабра і справядлівасці, патрыятызм і брацкую дружбу паміж беларусамі і расіянамі. Гэта фундаментальныя каштоўнасці, на якіх грунтуецца наша мінулае, сучаснасць і будучыня», — лічыць Раман Галоўчанка.

Ён адзначыў, што форум рэгіёнаў стаў эфектыўнай пляцоўкай для абмеркавання актуальных пытанняў беларуска-расійскага супрацоўніцтва, выпрацоўкі падыходаў да іх вырашэння, а таксама ўмацавання партнёрскіх адносін. «Менавіта тут выяўляецца гатоўнасць да шырокага ўзаемадзеяння па ўсіх кірунках нашага дыялогу», — сказаў Раман Галоўчанка.

## Эстафета памяці

**Намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Ігар ПЕТРЫШЭНКА** працягнуў думку кіраўніка беларускага ўрада. «Захоўваючы ў моладзі памяць аб вялікім мінулым, мы забяспечваем вялікую будучыню нашых дзяржаў, — заявіў ён. — Вялікая Перамога стала неад'емнай часткай светапогляду двух народаў. У сувязі з гэтым неабходна




дапамагчы моладзі захаваць і перадаць наступным пакаленням агульную гістарычную памяць пра Вялікую Айчынную вайну».

Ігар Петрышэнка падрабязна канкрэтызаваў прапановы па ўдасканаленні сумеснай работы па патрыятычным выхаванні моладзі. «Тэма Вялікай Айчыннай вайны павінна захаваць найважнейшае значэнне ў дзяржаўнай маладзёжнай палітыцы ў Беларусі і Расіі. Неабходна прыняць захады па ўдасканаленні падачы тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў адукацыйным працэсе па наступных напрамках: мадэрнізацыя навучальных дапаможнікаў, шырокае ўкараненне інтэрактыўных тэхналогій, уключэнне ў навучальныя праграмы і планы абавязковага наведвання знакавых памятных мясцін, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны», — сказаў ён.

У пытаннях удасканалення патрыятычнага выхавання моладзі неабходна ў поўным аб'ёме выкарыстаць патэнцыял Міжнароднай асацыяцыі музеяў Другой сусветнай вайны і Міжнароднага камітэта пры Музеі Перамогі на Паклоннай гары, звярнуў увагу віцэ-прэм'ер. Пры гэтым найважнейшым аспектам дзейнасці такіх аб'яднанняў павінен стаць знешні вектар, заснаваны ў тым ліку на маладзёжнай дыпламатыі.

«Неабходна прыняць дадатковыя меры па настойлівым прасоўванні праўды за мяжой. Добрыя прыклады ў гэтым напрамку ёсць. Мы павінны працаваць не толькі з тымі краінамі, з якімі ў нас усталяваліся сяброўскія і даверныя адносіны (напрыклад, з Кітаем), трэба адкрываць новыя далягляды», — падкрэсліў Ігар Петрышэнка.

Таксама ён звярнуў увагу на неабходнасць актуалізацыі падыходаў музеяў у рабоце з маладзёжнай аўдыторыяй. «З ёй трэба размаўляць на яе мове, але пры гэтым не апускацца да ўзроўню таннага папулізму і даносіць тое, што трэба данесці. З дапамогай сучасных дыстанцыйных тэхналогій можна ахапіць вялізную колькасць людзей ад Уладзівастока да Брэста з мінімальнымі выдаткамі», — адзначыў ён.

Больш актыўна, лічыць Ігар Петрышэнка, варта выкарыстоўваць і патэнцыял памятных мясцін Беларусі і Расіі: маладое пакаленне дзвюх краін павінна актыўна наведваць найбольш важныя мемарыяльныя комплексы (самыя знакавыя з іх можна аб'яднаць у адзін маршрут «Дарогі вайны»), новы імпульс неабходна надаць сумеснай пошукавай працы на месцах гібелі воінаў Чырвонай Арміі і мірных жыхароў.

Акрамя таго, віцэ-прэм'ер падкрэсліў вялікую важнасць сустрэч з ветэранамі. «Зносіны з імі — найкаштоўнейшая крыніца інфармацыі для моладзі. Гэту інфармацыю трэба зафіксаваць і перадаць. Толькі так застанецца непарыўная сувязь пакаленняў. Захоўваючы ў моладзі памяць аб вялікім мінулым, мы забяспечваем вялікую будучыню нашых дзяржаў», — рэзюмаваў Ігар Петрышэнка.

## Час абараняцца

На тэме праўды і постпраўды спыніўся ў сваім выступленні і **міністр інфармацыі Беларусі Ігар ЛУЦКІ.**

«Праўда сёння з'яўляецца вельмі важным і запатрабаваным інфармацыйным прадуктам, які прасоўваць на рынку масавай інфармацыі становіцца ўсё больш складана. За апошні час мы сталі сведкамі неадназначных інфармацыйных нападаў на нашы краіны. І апошнія падзеі ў Беларусі — найбольш яскравы прыклад таго, наколькі магутныя і разбуральныя па сваіх наступствах для грамадства яны могуць быць. Скажу галоўнае: праўда ў вельмі цяжкой сутычцы з постпраўдай выстаяла і перамагае. Тым не менш мы павінны выразна ўсведамляць, што гэты беларускі кейс, створаны нашымі знешнімі і ўнутранымі нядобразычліўцамі, ёсць не што іншае, як свайго роду проба пяра ў дачыненні да Расіі, абкатка новай мадэлі інфармацыйнай вайны», — сказаў ён.

Міністр адзначыў, што неабходна з усёй сур'ёзнасцю падысці да пытання забеспячэння агульнай інфармацыйнай бяспекі ў медыясферы — інфармацыйнай бяспекі Саюзнай дзяржавы. Ён падкрэсліў, што прыйшоў час не мірна будаваць, а рашуча абараняцца і контратакаваць.

«Мы гатовыя абмяркоўваць пытанні фарміравання поля агульнай бяспекі ў сферы масавай інфармацыі, перш за ўсё ў кантэксце адлюстравання знешняй інфармацыйнай агрэсіі і медыйнай падтрымкі адзін аднаго. У нас ёсць агульныя каштоўнасці, агульнае бачанне будучыні, велізарны культурна-гістарычны пласт. Усё гэта мы абавязаны абараніць, — заявіў Ігар Луцкі. — Давайце разбуральнай постпраўдзе эфектыўна супрацьпастаўім нашу агульную стваральную праўду».

## Яшчэ адзін вынік — паглыбленне даверу

Па словах **старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расіі Валянціны МАЦВІЕНКІ,** Форум рэгіёнаў Расіі і Беларусі трывала ўвайшоў у жыццё дзвюх краін. «На нашых пляцоўках, як нідзе, заўсёды адчувалася, наколькі глыбокая, натуральная і, што важна, абсалютна ўзаемная патрэба адзін у адным нашых народаў».

Цікавасць да паглыблення супрацоўніцтва з боку расійскіх і беларускіх рэгіёнаў стабільна вялікая, адзначыла расійскі палітык. Правядзенне форумаў акрамя эканамічнага эфекту дае яшчэ эфект культурны, гуманітарны, палітычны, сказала яна.

«Яго не выкажаш у лічбах, але ён відавочны і важкі. Я маю на ўвазе паглыбленне ўзаемаразумення і даверу паміж нашымі народамі, узаемнае духоўнае ўзбагачэнне, наладжванне сяброўскіх сувязяў і кантактаў паміж людзьмі. Бачу ў гэтым бясспрэчнае сведчанне таго, што саюз нашых дзяржаў, супрацоўніцтва нашых краін, сяброўства нашых народаў абапіраюцца на трывалую аснову», — дадала сенатар.

Праблемы ў эканамічным супрацоўніцтве Беларусі і Расіі ёсць, але яны пераадольныя, падкрэсліла спікер. «Пра гэта кажа той факт, што Расія застаецца ключавым інвестыцыйным і гандлёвым партнёрам Беларусі. Наша пазіцыя нязменная: мы за далейшае паглыбленне эканамічнага супрацоўніцтва нашых краін, удасканаленне яго механізмаў на аснове прынцыпаў раўнапраўя, узаемнай выгады, павагі інтарэсаў адзін аднаго. Тым больш што такі досвед у нашых краін назапашаны вялізны, у тым ліку на ўзроўні міжрэгіянальных сувязяў», — падкрэсліла парламентарый.

Сярод добрых прыкладаў кааперацыі прадпрыемстваў Валянціна Мацвіенка назвала праекты ў хімічнай, машынабудаўнічай, энергетычнай, транспартнай галінах, у аграпрамысловым комплексе. Таксама, паводле яе слоў, за апошнія гады прыняты сур'ёзныя крокі па якасным пашырэнні навуковага і адукацыйнага супрацоўніцтва, маладзёжнага ўзаемадзеяння.

Патэнцыял Саюзнай дзяржавы далёка не вычарпаны, адзначыла кіраўнік Савета Федэрацыі. «Упэўнена, разам мы знойдзем рашэнні, інструменты як мага больш поўнай яго рэалізацыі на карысць народаў Расіі і Беларусі», — рэзюмавала спікер.



## Галоўнае — не адстаць

**Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор РАПОТА** звярнуў увагу на тое, што лепшая даніна памяці нашым бацькам і дзядам, якія перамаглі ў Вялікай Айчыннай вайне, — забеспячэнне мірнага і дэмакратычнага развіцця брацкіх народаў Беларусі і Расіі, умацаванне дружбы, павышэнне дабрабыту і ўзроўню жыцця.

«У рамках Саюзнай дзяржавы ўдалося дамагчыся таго, што беларусы ў Расіі і расіяне ў Беларусі адчуваюць сябе, як у сваёй краіне, — як гэта было многія стагоддзі. Грамадзяне нашых краін у Саюзнай дзяржаве карыстаюцца роўнымі правамі, сацыяльнымі гарантыямі, свабодай перамяшчэння, працаўладкавання, роўным доступам да медыцынскіх і адукацыйных паслуг. Не трэба афармляць дазвол на працу, узаемна прызнаецца працоўны стаж для атрымання пенсіі і выслугі гадоў, — пералічыў ён. — Тыя, хто ведае пра гэта, карыстаюцца дасягнутым як само сабой зразумелым, нават не ўсведамляючы, што гэта не манна нябесная, а вынік саюзнага будаўніцтва. Мы фарміруем у Беларусі і Расіі адзіную эканамічную, навукова-тэхнічную і прававую прастору, аб'яднаную транспартную сістэму, адзіны паліўна-энергетычны рынак, агульную адукацыйную, культурную і інфармацыйную прастору, ажыццяўляем каардынацыю і ўзаемадзеянне ў сферах знешняй і міграцыйнай палітыкі, імкнемся праводзіць узгодненую макраэканамічную і прамысловую палітыку».

Саюзная дзяржава павінна быць нацэлена ў будучыню, падкрэсліў Рыгор Рапота. «Мы жывём у свеце, які імкліва змяняецца, трансфармуецца палітычная расстаноўка сіл, узнікаюць новыя тэхналагічныя ўклады. Гаворка ідзе ўжо пра пятую тэхналагічную рэвалюцыю, тэхналогіі 5G, паўсюдную лічбавізацыю, штучны інтэлект. Ад таго, наколькі эфектыўна мы ў Беларусі і Расіі, у Саюзнай дзяржаве адрэагуем на гэтыя працэсы, не выпадзем з іх, не апынемся ў ролі краін, якія даганяюць, будзе залежаць наша будучыня, ці акажацца саюзны праект годны памяці нашых бацькоў і дзядоў, годны Вялікай Перамогі, — адзначыў ён. — У нас ёсць для гэтага ўсё неабходнае. Ёсць воля беларусаў і расіян да яднання, матэрыяльна-тэхнічная база, назапашаны вопыт сумеснай працы».

Праектамі, якія аб'ядноўваюць стваральныя намаганні дзвюх дзяржаў, могуць, на думку дзяржсакратара, стаць будаўніцтва высакаскараснай чыгуначнай магістралі, якая злучыла б Санкт-Пецярбург, Мінск і Еўропу, аўтамагістраль «Мерыдыян», засваенне Арктыкі, адмена роўмінгу ў мабільнай сувязі Расіі і Беларусі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

ТРЭБА ПАМЯТАЦЬ...

# СВЕТ ІГНАРУЕ ТРАГІЧНЫЯ ЎРОКІ МІНУЛАГА

**Аб гэтым заявіў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ падчас правядзення секцыі «Подзвіг савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне — аснова выхавання патрыятызму і грамадзянскай адказнасці», якая прайшла ў рамках VII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Другім мадэратарам — з расійскага боку — выступіла яго калега з Савета Федэрацыі Лілія ГУМЕРАВА.**



## МОЛАДЗЬ У АДКАЗЕ

Новы відэафармат правядзення мерапрыемстваў форуму не паўплываў на скарачэнне заяўленай раней праграмы: дыстанцыйна паўдзельнічалі ў абмеркаванні актуальнай тэмы расійскія калегі ў маскоўскай студыі, беларускі ж бок выходзіў на сувязь з Нацыянальнай акадэміі навук нашай краіны. Што, дарэчы, было дастаткова сімвалічна: менавіта яе будынак выстаяў у Вялікую Айчынную вайну, адноўлены і працягвае функцыянаваць.

— Несумненна, што ў год 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне мы не можам пакінуць без увагі пытанні захавання гістарычнай памяці аб нашай агульнай Перамозе, — звярнуў увагу ўдзельнікаў секцыі і прысутных Віктар Лісковіч.

Ён падкрэсліў кроўную сувязь з братэрскімі народамі, разам з якімі папярэднія пакаленні спынілі катастрофу ХХ стагоддзя.

— Але свет ігнаруе трагічныя ўрокі мінулага, — перакананы парламентарый. — І чым далей мы ад даляемся ад падзей Вялікай Айчыннай вайны, тым больш агрэсіўныя і небяспечныя яны становяцца.

Таму, на яго думку, сёння ўсё больш надзённай робіцца неабходнасць не проста захаваць, але і абараніць Перамогу нашых народаў. Цяжар адказнасці за гэта, у першую чаргу, ляжыць на моладзі. Менавіта маладому пакаленню беларусаў і расіян неабходна прыкласці ўсе намаганні, каб зберагчы мір і спакой у нашых краінах, памятаючы пра тое, праз што давялося прайсці нашым народам.

Дарэчы, як адзначалі выступоўцы, у гэтым кірунку ў Беларусі і Расіі рэалізаваны цэлы комплекс мер на дзяржаўным узроўні, у Саюзнай дзяржаве штогод рэалізуюцца шматлікія праекты, звязаныя са згаданай важнай тэмай. Адным з такіх з'яўляецца будаўніцтва і ўрачыстае адкрыццё сёлета Ржэўскага мемарыяла Савецкаму салдату. За кошт сродкаў саюзнага бюджэту ідзе рэканструкцыя аб'ектаў Брэсцкай крэпасці. Так, вялікая работа вядзецца па ўвекавечанні памяці аб Вялікай Айчыннай вайне і яе героях, патрыятычным выхаванні ў дзвюх краінах, а ці дастатковая?

## АБАРАНІЦЬ ГІСТАРЫЧНУЮ ПРАЎДУ

Нягледзячы на вялікую колькасць кніг і навуковых прац па гэтай тэматыцы, з'яўляюцца і іншыя, асноўны матыў якіх — нежаданне паглыбіць веды аб тым геранічным і трагічным перыядзе, а імкненне да агульнага ачарнення, пошуку пралікаў і памылак савецкага камандавання. На гэту тэндэнцыю звярнуў увагу **старшыня Прэзідыума НАН Беларусі Уладзімір ГУСАКОЎ.** Ён нагадаў, што ў шэрагу еўрапейскіх краін і некаторых былых савецкіх рэспубліках сёння руйнуюцца помнікі савецкім воінам-вызваліцелям.

— Так дзякуе сёння «цывілізаваная Еўропа» савецкім воінам, якія выратавалі яе ад карычневай чумы! — падкрэсліў акадэмік.

Ён адзначыў, што калі раней секцыя даследчыкі казалі аб асобных фальсіфікатарах, то сёння гучаць не проста заклікі неанацыстаў, а ўжо прымаюцца рэзалюцыі на ўзроўні міжпарламенцкіх асамблей.

— 3 ліпеня 2009 года Парламенцкая асамблея АБСЕ прагаласавала за прыняцце рэзалюцыі «Аб уз'яднанні падзеленай Еўропы: заахвочванне правоў чалавека і грамадскіх свабод у рэгіёне АБСЕ ў XXI стагоддзі», — прывёў ён у прыклад дакумент, які прадпісаў зрабіць 23 жніўня (дзень падпісання пакта Молатава—Рыбентропа) днём памяці ахвяр нацызму і сталінізму. — Ужо праз дзесяць гадоў, 19 верасня 2019 года, Еўрапейскі парламент прымае рэзалюцыю, у якой назваў савецка-германскую дамову аб ненападзенні ад 23 жніўня 1939 года прычынай пачатку Другой сусветнай вайны.

Тым самым фальсіфікацыя гісторыі на Захадзе, упэўнены акадэмік, выведзена на прынцыпова новы ўзровень.

— Калі раней фэйкі агучваліся публіцыстамі ці асобнымі палітыкамі, то цяпер хлусню пачынаюць адкрыта легалізаваць на міждзяржаўным узроўні, — падкрэсліў Уладзімір Гусакоў.

Ён з жалем канстатаваў, што гэтыя і іншыя акцыі парламентарыяў аб'яднаных еўрапейцаў не знайшлі калектыўнага асуджэння з боку ААН. Яны не атрымалі належнай ацэнкі з боку парламентарыяў Саюзнай дзяржавы і краін СНД, адзначыў старшыня Прэзідыума НАН Беларусі. Ён звярнуў увагу, што сёння часта гучаць негатыўныя ацэнкі падпісання германа-савецкай дамовы аб ненападзенні, аднак трэба памятаць, што да падпісання гэтай дамовы з СССР Германія заключыла такія ж з 12 краінамі. І гэтая — была апошняй у шэрагу іншых.



— Нягледзячы на прымаемыя меры па ўмацаванні абараназдольнасці мяжы, савецкае кіраўніцтва імкнулася «не даць праціўніку нагоды для агрэсіі», не даць ні адзінага шанцу абвінаваціць СССР у правакацыі, паколькі разумела недастатковую гатоўнасць краіны да вайны, — тлумачыць Уладзімір Гусакоў. — Менавіта гэтым збольшага могуць быць растлумачаны вялізныя страты першых месяцаў Вялікай Айчыннай вайны.

У гэтай сувязі нялішне будзе згадаць страты нашай краіны ад гэтай навалы: каля трох мільёнаў чалавек, германскія захопнікі зруйнавалі 209 з 270 беларускіх гарадоў і райцэнтраў, знішчылі дзевяць тысяч вёсак, з іх 5295 спалілі разам з усімі жыхарамі ці часткай насельніцтва, 628 вёсак цалкам раздзялілі лёс Хатыні, з іх 186 так і не адрадзіліся пасля... І на фоне гэтага спробы перапісаць гісторыю выглядаюць асабліва жахліва. Тым больш што жывых сведак ваенных падзей становіцца ўсё менш і менш.

Каб захаваць гэтую памяць і данесці яе да наступных пакаленняў, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі ініцыявала ўсебеларускую акцыю «Народны летапіс Вялікай Айчыннай вайны: успомнім усіх!».

— Мы звярнуліся да кіраўніцтва абласных і раённых выканаўчых камітэтаў, устаноў адукацыі і культуры, грамадскіх аб'яднанняў, да ўсіх зацікаўленых грамадзян, каб разгарнуць работу па зборы ўспамінаў і дакументаў, якія захаваліся, удзельнікаў барацьбы з нацысцкімі агрэсарамі ў гады вайны, — праінфармаваў удзельнікаў секцыі Уладзімір Гусакоў. — Сама ідэя атрымала жывы водгук, ужо выдадзена першая кніга народнага летапісу і рыхтуюцца да выдання наступныя тамы.

## АД МІНУЛАГА ДА СУЧАСНАСЦІ

Якія наступствы ад фальсіфікацыі гісторыі ў сродках масавай інфармацыі? Сваім меркаваннем падзяліўся **старшыня праўлення Беларускага саюза журналістаў Андрэй КРЫВАШЭЕЎ.** Ён перакананы, што кампанія па фальсіфікацыі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў медыя-асяродку Беларусі і ўсёй постсавецкай прасторы, на жаль, з'яўляецца адным з інструментаў маніпуляцый. У кароткай перспектыве, звяртае ўвагу эксперт, ажыццяўляецца хуткі зрух шырокай грамадскай дыскусіі з разумнай, маральнай і дапушчальнай галіны меркаванняў у вобласць радыкальных, эксцэнтрычных і неймаверных раней ацэнак і сцвярджэнняў.

— Яркім прыкладам такога зруху для Беларусі з'яўляецца так званая новая нармальнасць у дыскусіі аб дзяржаўных і так званых нацыянальных (па факце нацыяналістычных) сімвалаў Беларусі, — кажа Андрэй Крывашэеў. — Відэарад пратэсных дзей пад «бел-чырвона-белымі» сцягамі каля сцен Дзяржаўнага Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца відавочным таму сведчаннем. Сцяг, які выкарыстоўвалі калабарацыяністы ў перыяд акупацыі, пад якім праводзіліся карныя аперацыі, масавыя расправы і генацыд быў унесены ў пратэсную свядомасць як сімвал «новай Беларусі». Палітычны крызіс і медыя-агрэсія з боку замежных інфармацыйных агентаў сталі каталізатарам зруху «акна Авертона» ў бок гістарычнага дылентантызму.

На яго думку, адказам на гэта павінна стаць пашырэнне экспазіцыі, прысвечанай трагічнаму перыяду акупацыі беларускай зямлі ў тым самым музеі ВАВ, і ў многіх іншых музеях і архівах краіны.

— Наша журналісцкая адказнасць — паказаць гэтыя гістарычныя факты на мове класічных і новых медыя, праз блогі і дакументалістыку, расследаванні і рэпартажы, — перакананы ён. — Проста замоўчваннем няёмкай гісторыі мы ўжо нічога не даможамся.

Адным з інструментаў у медыя-сферы з'яўляецца рэгулярны Фестываль дакументальнага кіно «Еўразія. DOC», адной з нязменных тэм якога з'яўляецца дакладная рэфлексія аб гісторыі ВАВ. Адкрытыя паказы ў найлепшых кінатэатрах Мінска і Смаленска, панэльныя дыскусіі, сустрэчы з гледачамі аўтараў, рэжысёраў, гісторыкаў і крытыкаў даюць рэальную зваротную сувязь з грамадствам па ваеннай гістарычнай тэматыцы, перакананы выступоўца, ён жа — выканаўчы дырэктар V Міжнароднага фестывалю дакументальнага кіно краін СНД «Еўразія. DOC».

Дарэчы, сімвалічна, што пяты юбілейны фестываль распачаў сваю работу ў Смаленску 28 верасня — у дзень правядзення тэматычнай секцыі Форуму рэгіёнаў у беларускай сталіцы. Цэнтральная тэма фэсту — перамога савецкага народа над нацыянал-сацыялізмам. З 28 фільмаў 20 прысвечаны гэтай тэме. Андрэй Крывашэеў, між іншым, прапанаваў арганізаваць публічныя паказы найлепшых стужак фестывалю ў рэгіёнах Беларусі і Расіі. Суправаджаць такія паказы дыялогам і вострай дыскусіяй аб падзеях і людзях, якія рабілі агульную гісторыю Перамогі.

Мадэратары — Віктар Лісковіч і Лілія Гумерава — неаднойчы падчас работы секцыі падкрэслівалі неабходнасць стымулявання даследчай работы сярод моладзі па тэматыцы Вялікай Айчыннай вайны, папулярызацыі яе вынікаў у сецібе і прасоўвання гістарычна-турыстычнага кірунку, калі магчыма ўвачавідкі пераканацца, якія могуць быць трагічныя наступствы ад гістарычнай непамятлівасці... І сёння галоўная задача — выратаваць гістарычную праўду аб Перамозе ад нападак, якія імкнуцца перавярнуць кола гісторыі.

**Вольга АНУФРЫЕВА,**
**фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

АГРАРНЫ ВЕКТАР

# МОДА НА «ІНТЭГРАЦЫЮ Ў ГОРАД»: СПРАВІЦЦА З НАСТУПСТВАМІ

**У рамках VII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў Дзяржынскім раёне на базе аднайменнага агракамбіната «Дзяржынскі» ў рэжыме відэа-канферэнцыі адбылося пасяджэнне секцыі на тэму «Стварэнне ўмоў для павышэння сацыяльнай і эканамічнай актыўнасці сельскай моладзі ў мэтах устойлівага развіцця рэгіёнаў Беларусі і Расіі».**



## ТОН РАЗМОВЫ ЗАДАЛІ СЕНАТАРЫ

Мадэратарамі секцыі выступілі **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Уладзімір ЛУК'ЯНАЎ** і **старшыня Камітэта Савета Федэрацыі па аграрна-харчовай палітыцы і прыродакарыстанні Аляксей МАЁРАЎ.** У абмеркаванні пытанняў па замацаванні моладзі на вёсцы, павышэнні яе сацыяльна-эканамічнай актыўнасці ў аграпрамысловым сектары таксама ўдзельнічалі члены Савета Рэспублікі і сенатары Расійскай Федэрацыі, прадстаўнікі беларускіх і расійскіх міністэрстваў і ведамстваў, органаў мясцовага кіравання і самакіравання, дзелавых колаў і маладзёжных арганізацый.



Старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў.

Уладзімір Лук'янаў, у прыватнасці, зазначыў: моладзь — гэта найбольш дынамічная частка грамадства, што абумоўлена яе актыўным пошукам свайго месца ў жыцці. Праблемы, з якімі сутыкаецца вясковая моладзь, — гэта ў першую чаргу цяжкасці з працаўладкаваннем, адсутнасць уласнага жылля, мода на «інтэграцыю ў горад». Пошук прапаноў, якія накіраваныя на стварэнне сучаснага сельскага рынку працы, дазволіць палепшыць структуру занятасці насельніцтва, замацаваць кваліфікаваныя кадры, развіць вытворчасць і інфраструктуру, прыцягнуць увагу грамадства да праблем маладых рабочых і спецыялістаў на вёсцы. Таму цяжка пераацаніць значэнне сённяшняга мерапрыемства, у рамках якога маецца выдатная магчымасць разам вызначыць прыярытэты і выпрацаваць меры, якія дазволілі б стварыць умовы для ўстойлівага развіцця рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

Аляксей Маёраў падкрэсліў, што Беларусь і Расія маюць сур'ёзныя канкурэнтныя перавагі для развіцця аграрнай вытворчасці. Для эфектыўнай рэалізацыі гэтых пераваг неабходна стварыць эканамічныя і сацыяльныя ўмовы. Без маладых кадраў на сяле ў аграпрамысловым комплексе і ў сацыяльнай сферы такое развіццё немагчыма, выказаў упэўненасць сенатар. Ён нагадаў, што ў гэтых мэтах сёлета пачалася рэалізацыя Дзяржаўнай праграмы Расіі па комплексным развіцці сельскіх тэрыторый. Аляксей Маёраў таксама праінфармаваў аб стварэнні часовай камісіі Савета Федэрацыі па захаванні і развіцці народных мастацкіх промыслаў. Бо, на яго думку, у творах народных промыслаў выяўляецца расійская ментальнасць, характэрныя рысы культуры, унікальнасць традыцый. Таму трэба захаваць для маладога пакалення нацыянальны здабытак і зрабіць так, каб гэта стала драйверам развіцця тэрыторый і іх турыстычнага патэнцыялу. Сенатар запрасіў беларускіх калег да супрацоўніцтва і аб'яднання намаганняў у гэтай сферы.

## ЗА ЯКОЙ ВЁСКАЙ БУДУЧЫНЯ?

Цікавыя і змястоўныя былі выступленні намеснікаў кіраўнікоў ведамстваў, якія, відаць, больш за іншых зацікаўленыя ў пастаянным прытоку маладых кадраў у сельскагаспадарчую галіну. Прамоўцы падзяліліся сваім бачаннем вырашэння застарэлых і часам аднолькавых для абедзвюх краін праблем на вёсцы, расказалі аб ужо зробленым для павышэння сацыяльнай і эканамічнай актыўнасці сельскай моладзі. Каб ісці ў нагу з часам, па словах **намесніка міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Ігара БРЫЛО,** у апошнія гады наспелі змены ў практыцы работы па замацаванні прафесійных кадраў на вёсцы.

На яго погляд, трэба актыўней спрыяць павышэнню матывацыі юнакоў і дзяўчат заставацца жыць і працаваць на роднай зямлі. Ён расказаў аб станоўчым досведзе, які за апошнія гады набыты ў Беларусі па працаўладкаванні моладзі на вёсцы. Сярод станоўчых крокаў — пашырэнне мэтавага прыёму маладых людзей на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці ў ВНУ і каледжы. Гэта дазваляе рыхтаваць надзейны рэзерв кадраў. Ігар Брыло расказаў і аб іншых захадах, у тым ліку і пра бясспрэчныя перавагі аграгарадкоў, і пра выдзяленне пасля размеркавання жылля маладым спецыялістам ці сродкаў на яго аплату.

У Беларусі шмат надзей звязваюць з рэалізацыяй канцэпцыі «Вёска будучага». Гэта будуць прыгожыя добраўпарадкаваныя аграгарадкі новага тыпу з развітой інжынернай, транспартнай інфраструктурай і сацыяльнай сферай, дзіцячымі пляцоўкамі, кафэ, аказаннем бытавых і іншых паслуг не горш, чым у горадзе. Прыкладам вёскі будучага Ігар Брыло назваў гарадскі пасёлак Копысь у Аршанскім раёне, аграгарадок Сноў у Нясвіжскім раёне і шэраг іншых.

А пакуль неаднолькавыя ўмовы жыцця і працы ў параўнанні з горадам таксама не спрыяюць замацаванню моладзі на вёсцы і ў Расіі. **Намеснік міністра сельскай гаспадаркі гэтай краіны Уладзімір ЛЕБЕДЗЕЎ** расказаў аб тым, што ў Расіі робіцца па падрыхтоўцы кадраў для аграрнага сектара. Так, у ВНУ перагледзелі планы навучання, адукацыю можна атрымаць за кошт бюджэту. Шмат надзей у Расіі ўскладаюць на рэалізацыю дзяржаўнай праграмы комплекснага развіцця тэрыторый. Яна ўяўляе сабой суцэльны комплекс мер, у тым ліку, і па стварэнні камфортных умоў жыцця для сельскай моладзі. Магчыма, гэта стане расійскім варыянтам вёскі будучага, дзе ўмовы жыцця будуць не горшыя, а можа і лепшыя за гарадскія. А даходы таксама дасягнуць узроўню заробкаў гараджан, сказаў Уладзімір Лебедзеў.




Пасяджэнне секцыі № 4.

## ПАЧЫНАЦЬ ТРЭБА СА ШКОЛЫ

На думку **рэктара Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта тэхналогій і кіравання імя К. Разумоўскага Валянціны ІВАНОВАЙ,** тэму першачарговай ролі сельскай школы ў замацаванні кадраў на вёсцы трэба ўсяляк уздымаць, абмяркоўваць. Бо менавіта ў сельскай школе, ключ да поспеху ў вырашэнні многіх як эканамічных, так і сацыяльных праблем сельскай гаспадаркі. З гэтай нагоды рэктар лічыць: было б карысна стварыць міждзяржаўную асацыяцыю аграшкол Расіі і Беларусі. Увогуле наспела задача правядзення маштабнай размовы па праблематыцы аграрнай бізнес-адукацыі моладзі.

Сярод выступоўцаў было нямала і маладых людзей. Падчас дыскусіі яны агучылі не толькі прычыны, якія спрыяюць адтоку сельскай моладзі ў гарады. Маладыя ўдзельнікі размовы таксама выказалі прапановы па актывізацыі працэсу стварэння ўмоў для развіцця сучаснага рынку працы, паляпшэнні ў цэлым структуры занятасці насельніцтва, замацаванні маладых людзей на вёсцы.

Маладыя ўдзельнікі дыскусіі гаварылі і на іншыя важныя тэмы. Напрыклад, аб актывізацыі лічбавай трансфармацыі сельскай гаспадаркі, дзейнасці па прыцягненні моладзі ў рады фермераў, іх падтрымцы з боку дзяржавы ў збыце сельгаспрадукцыі і г. д. У час работы секцыі прагучала шмат прапаноў. Адна з іх — працягнуць гэту размову ў наступным годзе. Было прынята сумеснае рашэнне аб правядзенні ў 2021 годзе асобнага беларуска-расійскага форуму сельскай моладзі і бізнес-гульні «Фермер-пачатковец» у рамках рэалізацыі Усерасійскага маладзёжнага праекта.

Але ёсць шанц грунтоўна абмеркаваць праблемы сельскай моладзі абедзвюх краін раней, ужо сёлета. І, звярніце ўвагу, не ў фармаце відэа-канферэнцыі, а ў ходзе звычайнай сустрэчы ў рамках другога этапу VIII Беларуска-расійскага маладзёжнага форуму. Ён запланаваны на снежань гэтага года ў Пінску. Нагадаем, першы этап VIII Беларуска-расійскага маладзёжнага форуму адбыўся днямі і быў прымеркаваны да VII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# ЗАГАДКА ФІНАЛУ ЯСЕНІНА

**На тэлеканале АНТ гледачам прапануюць да прагляду біяграфічную драму «Ясенін» рэжысёра Ігара Зайцава, якая ўбачыла свет у 2005 годзе. Фільм з'яўляецца экранізацыяй рамана Віталя Бязрукава «Ясенін. Хроніка забойства», а ў галоўнай ролі сын аўтара, вядомы Сяргей Бязрукаў.**



Кінастужка выкладае канспіралагічную версію смерці вялікага паэта. Сярэдзіна 1980-х. Прайшло 60 гадоў пасля гібелі класіка. Палкоўнік Аляксандр Хлыстоў па пошце атрымлівае стары фотаздымак, на якім Ясенін сфатаграфаваны пасля смерці. Па правілах, следчы павінен пачаць расследаванне. Але герой робіць па-свойму і вырашае самастойна даследаваць абставіны справы. Паглыбіўшыся ў вывучэнне жыцця паэта і яго таямнічай гібелі, Хлыстоў выходзіць на шматлікія версіі таго, як усё магло быць. І вось у той час, як ён, здаецца, наблізіўся да праўды, справа прымае нечаканы кірунак...

Фільм заснаваны на рэальных фактах і вялікай колькасці дакументальных, архіўных і фотаілюстрацыйных матэрыялаў. Па часе дзеянне разбіта на два перыяды — пачынаецца ўсё ў 10-я гады мінулага стагоддзя, а потым пераносіць гледачоў у 20-я. Тут можна прасачыць і апошнія гады жыцця паэта, і яго адносіны з уладай, сябрамі і з жанчынамі... А галоўнае ўбачыць абставіны, у якіх жыў і рэалізоўваў сябе Сяргей Ясенін.

Не прапусціце фільм 11 кастрычніка на тэлеканале АНТ.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 104

Аўтар сённяшняй задачы — С. Крэйнін (гл. дыяграму).




Белыя: Kph8, Лf6, Лh4, Cg3, Kg7, пd4 (6).

Чорныя: Kpg5, пп. f7, g6, g4 (4).

Мат за 2 хады.

*Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru*

* * *

Ва ўмовах пандэміі буйныя шахматныя турніры праходзяць рэдка, але ў Чэлябінску адбыліся адразу два міжнародныя спаборніцтвы, у якіх выступілі і беларускія шахматысты. Спачатку прайшоў Мемарыял Ігара Курносава па хуткіх шахматах (188 удзельнікаў). Аляксей Аляксандраў у выніку заняў 13-е месца, Кірыл Ступак — 40-е, Вольга Бадэлька — 44-е (трэці прыз сярод жанчын). Потым адбыўся Мемарыял Аляксандра Панчанкі (125 удзельнікаў) — ужо па «класічнай» гульні. К. Ступак фінішаваў на 18-м месцы, В. Бадэлька — на 49-м, А. Аляксандраў — на 57-м.

Вось некалькі пераможных партый беларусаў з Мемарыялу А. Панчанкі.

Кірыл Ступак — Аляксандр Сувораў. 1. d4 d5 2. Kf3 Kf6 3. c4 e6 4. Cg5 Ce7 5. Kc3 Kbd7 6. e3 0-0 7. Фc2 c6 8. Cd3 h6 9. Ch4 dc 10. C:c4 b5 11. Cd3 Cb7 12. 0-0 Лc8 13. Фe2 b4 14. Ke4 c5 15. K:f6+ C:f6 16. C:f6 Ф:f6 17. Ca6 C:f3 18. Ф:f3 Ф:f3 19. gf Лcd8 20. dc K:c5 21. Cb5 Лd2 22. Лfc1 Kd3 23. C:d3 Л:d3 24. Лc7 Лd2 25. Лb1 Лa8 26. Kpf1 a5 27. Kpe1 Лd5 28. Лd1 Лh5 29. Лdd7, 1:0.

Аляксей Грэбнеў — Вольга Бадэлька. 1. e4 c5 2. Kf3 d6 3. d4 cd 4. K:d4 Kf6 5. Kc3 Kc6 6. Ce2 e5 7. Kb3 h6 8. Ce3 Ce7 9. Фd2 Ce6 10. 0-0 a6 11. a4 0-0 12. a5 C:b3 13. Cb6 Фd7 14. cb Cd8 15. Фe3 C:b6 16. Ф:b6 Kd4 17. Cc4 Лfc8 18. Лad1 Лab8 19. Фb4 Фc7 20. Фa4 Фc5 21. h3 Лd8 22. Лd3 Фc6 23. Лfd1 Ф:a4 24. ba Kpf8 25. Л:d4 ed 26. Л:d4 Лdc8 27. Kd1 Kd7 28. Ke3 Ke5 29. f4 Kc6 30. Л:d6 Лd8 31. Л:d8+ Л:d8 32. Cd5 K:a5 33. Kpf2 Лc8 34. Kpe2 Kc6 35. Kpd2 Лc7 36. Kc2 f5 37. Kpd3 Ke7 38. Cb3 Лd7+ 39. Kpe3 Лd1 40. Cc4 Лc1 41. Cd3 Лb1 42. b4 Лb3 43. Kpd4 fe 44. C:e4 b6 45. Kpc4 Лg3 46. Kd4 Лa3 47. Cc2 Kpe8 48. Ke6 Kpd7 49. Kd4 Kpd6 50. Cb3 Лa1 51. Cc2 Лf1 52. f5 Kd5 53. Cd3 Лc1+ 54. Kc2 Ke3+ 55. Kpc3 K:c2 56. C:c2 Kpe5 57. Kpb3 Лg1 58. Cd3 a5, 0:1.

Аляксей Аляксандраў — Артур Габрыелян. 1. d4 Kf6 2. c4 c5 3. d5 e6 4. Kc3 ed 5. cd d6 6. Kf3 g6 7. Cf4 Cg7 8. Фa4+ Cd7 9. Фb3 b5 10. C:d6 Фb6 11. Ce5 0-0 12. e3 c4 13. Фd1 b4 14. Ke2 Лc8 15. Kf4 c3 16. Cd3 Cb5 17. 0-0 Kbd7 18. Cd4 Фa5 19. bc bc 20. C:b5 Ф:b5 21. Лc1 Ke4 22. Фc2 Kdf6 23. Лfd1 Лc4 24. Ke5 Лb4 25. f3 Лb2 26. Фd3 Kd6 27. Ф:c3 Л:a2 28. Kc6 Kfe8 29. e4 Ch6 30. Ce3 Cg7 31. Фc5 Фb3 32. Kd3 a5 33. e5 Kf5 34. Cf2 Ch6 35. f4 Kc7 36. d6 Ke6 37. Фc4 a4 38. Ф:b3 ab 39. Лb1 Лc2 40. Kdb4 C:f4 41. Л:b3 C:h2+ 42. Kp:h2 Л:f2 43. d7 Лe2 44. Лdd3 Kpg7 45. Лa3 Л:a3 46. Л:a3 Лd2 47. Лd3 Лe2 48. Kd5 Kph6 49. Kc7 Kfg7 50. Лh3+ Kpg5 51. Л:h7 Лd2 52. K:e6+ K:e6 53. Л:f7, 1:0.

* * *

У Рагачове прайшлі рэспубліканскія турніры па бліцы (92 удзельнікі: 1 — міжнародны майстар Вячаслаў Зарубіцкі; 2 — майстар ФІДЭ Ягор Сіліч; 3 — Аляксей Чэрапаў) і па хуткіх шахматах (94 удзельнікі: 1 — гросмайстар Мікіта Маёраў; 2 — майстар ФІДЭ Юрый Борсук; 3 — майстар ФІДЭ Арцём Стрыбук).

У анлайн-турніры па бліцы на сайце chess.com (782 удзельнікі) Уладзіслаў Кавалёў фінішаваў на 17-м месцы, Дзяніс Лазавік — на 28-м. Праз інтэрнэт адбыўся і бліц-матч гросмайстраў Сяргея Жыгалкі (Беларусь) і Дзмітрыя Андрэйкіна (Расія). Беларус саступіў: сем перамог, 12 пройгрышаў, тры нічыі.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1. Фg8! Першыя правільна адказалі Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч, Віктар Жук, Сяргей Цяльпук, Васіль Барысевіч.

**Вадзім ЖЫЛКО.**





# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

## Чалавечае сумленне ў класічным сюжэце

**Імя Міхаіла Пташука — знакавае для айчыннага кінематографа. Яго фільмы, у ліку якіх «У жніўні 44-га...», «Знак бяды», «Час выбраў нас» і многія іншыя, любяць і памятаюць... А ваенная драма «Вазьму твой боль» сёлета адзначае 40-годдзе з моманту выхаду. На наступным тыдні яе пакажа ў эфіры «Беларусь 3».**

Кінастужка знятая па аднайменным рамане Івана Шамякіна. У ёй расказваецца, як у вёску пасля доўгага пазбаўлення волі вяртаецца былы паліцай Рыгор Шышковіч, які быў прызнаны вінаватым у смерці маці і сястры саўгаснага кіроўцы Івана Батрака. За службу ў паліцыі здраднік адбыў доўгі тэрмін у турме, але застаўся жыць, таму што яго віну ў расстрэле даказаць не змаглі. Сустрэча з Шышковічам заставіла Івана зноў перажыць падзеі той жахлівай восені, калі ён, схаваўшыся пад печчу, бачыў, як паліцаі расстрэльвалі яго родных. З таго моманту жыццё Івана ператвараецца ў кашмар. Хоць некаторыя з вяскоўцаў і лічаць, што Шышковіч ужо атрымаў па заслугах, але Батрак не верыць у гэта — і аказваецца, што недарэмна... Рыгор спрабуе забіць адзінага сведку не раскрытага да канца злачынства.

Варта адзначыць, што сюжэт рамана і кінастужкі ўзяты з рэальнага жыцця: аднойчы вясковыя жанчыны здзейснілі самасуд над паліцаем, які пасля турмы вярнуўся ў роднае паселішча. «Вазьму твой боль» стаў пятай экранізацыяй твораў беларускага пісьменніка. Вядомыя гледачу і такія экранізацыі, як «Сэрца на далоні», «Вясельная ноч», «Гандлярка і паэт» і іншыя.

Міхаіл Пташук амаль усе свае фільмы здымаў на сваёй радзіме — каля вёскі Федзюкі ў Ляхавіцкім раёне. І карціна «Вазьму твой боль» не стала выключэннем. У сваім дзённіку рэжысёр напісаў: «Калі ўважліва паглядзець мае фільмы, то ў кожным з іх адна і тая ж хата ў планіроўцы... Я ведаю кожны рух Сцепаніды са «Знака бяды», кожны рух Івана Батрака з шамякінскага рамана «Вазьму твой боль». Не трэба было нічога прыдумляць. Усе героі рухаліся па маім федзюкоўскім доме...» Падчас здымак



фільма не абышлося і без надзвычайных сітуацый. Так, у адным з эпізодаў, дзе спальвалі дом, акцёр (які іграў Івана ў дзяцінстве) ледзь паспеў выбрацца з полымя. Яшчэ адна трагедыя магла адбыцца і падчас здымак Уладзіміра Гасцюхіна (выканаўца ролі Івана-дарослага) за рулём камбайна. Пасля ў інтэрв'ю акцёр расказваў, што ніяк не мог спыніць машыну. Дарэчы, гэта была першая роля ў кіно Гасцюхіна, калі ён, ужо вядомы ў той час акцёр, перабраўся ў Мінск да каханай і атрымаў мясцовую прапіску.

У рамане «Вазьму твой боль» ёсць такія словы: «Пачуць водар хлеба ў зярнятах можа толькі той, хто вырас на зямлі». Экранізацыя твора была ўдастоена Дзяржаўнай прэміі, але, мабыць, важней любых узнагарод тое, што кінастужка стала яшчэ адным «зярняткам» класікі беларускага кінематографа.

**Алена ДРАПКО.**


## «Восень са «Звяздой»



Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на IV квартал або II паўгоддзе 2020 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 14 кастрычніка 2020 года ў рэдакцыю на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск.

Сярод падпісчыкаў 16 кастрычніка 2020 года будуць разыграны 7 здрабняльнікаў-чопераў Galaxy GL і суперпрыз — сушка для агароднін і садавіны Redmand. Вынікі будуць апублікаваныя ў газеце «Звязда» да 25 кастрычніка 2020 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 снежня 2020 года пры наяўнасці квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або II паўгоддзе 2020 года і пашпарта. Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Восень са «Звяздой» чытайце ў нумары 165 газеты «Звязда» ад 26 жніўня.

**Тэлефон для даведак (017) 263 66 73.**

**Тэрмін правядзення гульні — з 01.09.2020 да 31.12.2020.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3840 ад 21.08.2020 года выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або II паўгоддзе 2020 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ______

Падпіска афармлена і аплачана ў ______ *(аддзяленне сувязі)*

на IV квартал або II паўгоддзе 2020 года

Хатні адрас і тэлефон *(абавязкова)* ______ *(індэкс)*

Удачы ў розыгрышы!

# панядзелак, 5 кастрычніка

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.15** Навіны надвор'я.
**10.40, 12.10, 18.35, 19.20 Меладрама «Бумеранг» (16+).**
**13.05, 15.25 Меладрама «Лепш за ўсіх» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**18.15, 0.10** «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка.
**21.55 Серыял «След» (16+).**
**23.50** Арэна.
**0.30** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 19.25** Тэлебарометр.
**9.05, 20.00** «Зразумець. Дараваць». Дакудрама (16+).
**10.10** «Сямейныя гісторыі». Дакудрама (16+).
**10.45** Камень, нажніцы, папера (16+).
**11.20** «Да пабачэння» (16+).
**12.10 Прыгоды «Бель і Себасцьян» (6+).**
**13.50** «ЖаннаПажані» (16+).
**14.50** М/с «Стыч!» (6+)
**15.35** Анімацыйны фільм «Таямніца Како» (6+).
**17.15 Баявік «Джон Картэр» (12+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.15** «Тата напаў» (16+).
**23.40 Серыял «Анатомія страсці» (16+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.25** «Беларуская кухня». Грыбы лісіцы з мясам у малацэ.
**8.05, 12.00, 20.20** Навіны культуры.
**8.25, 12.20** Гэты дзень.
**8.30** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.30** «Кадры жыцця». Дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь Уладзімір Пракапцоў.
**10.20** «Я хачу гэта ўбачыць!»
**10.45** «Паўстанак». **Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**12.55, 17.10 «Без вестак зніклы». Маст. фільм (12+).**
**14.10** «Наперад у мінулае».
**14.40, 21.40 «Развітанне». Маст. фільм (12+).**
**16.45** «Навукаманія» (6+).
**18.30** «Что я люблю, во что я верю...» Юбілейны канцэрт народнага артыста Беларусі Валянціна Дудкевіча.
**20.05** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05** «Апошні дзень». Элем Клімаў (12+).
**23.50** «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Вера Блінцова і Любоў Кірылава.

## Беларусь 5

**7.00** Спорт-мікс.
**7.10, 15.50** Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. «Вікторыя» (Смалявічы) — ХК «Рытм» (Гродна).
**8.40** Піт-стоп.
**9.15** Вынікі тыдня.
**10.00, 17.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі.
**12.00, 23.15** Тэніс. Ралан Гарос.
**14.05** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Зеніт» (Санкт-Пецярбург) — «Цмокі-Мінск».
**18.55** Хакей. КХЛ. «Ак Барс» (Казань) — «Салават Юлаеў» (Уфа). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**21.20** На грані фолу. Футбольны агляд.
**22.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.

## АНТ

**6.00, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**7.00** [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 0.55** Нашы навіны.
**9.15** «Контуры».
**10.05** «Жыць здорава!» (16+)
**11.15 Серыял «Ясенін» (12+).**
**12.10** «Модны прыгавор» (6+).
**13.15, 22.15 Серыял «Ніткі лёсу» (16+).**
**15.05** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20, 0.05** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**18.55** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10 Серыял «Варажбітка» (16+).**

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**8.40** «Тыдзень».
**10.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.20** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.40, 21.20** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.30** Навіны «24 гадзіны».
**13.45, 23.05** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.30, 20.30** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.25, 16.50 «Сын бацькі народаў». Серыял (16+).**
**20.00, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Міншчына».
**22.05** «Глядзець усім!» (16+)
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.50** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**0.30** «Мінтранс» (16+).

## МІР

**5.00 Серыял «Сяброўка асобага прызначэння». 1—2-я серыі.**
**8.15, 10.10 Серыял «Блізкія людзі». 1—4-я серыі [СЦ] (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 17.15** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 16.15** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**18.15, 19.25 Серыял «Кулінар» [СЦ] (16+).**
**22.40, 3.00** «Гульня ў кіно» (12+).
**23.25, 0.15** «Сусветныя гульні розуму» (12+).
**0.50 Серыял «Мухтар. Новы след» [СЦ] (16+).**
**3.35 Маст. фільм «Сямёра смелых» (12+).**

## РТР—Беларусь

**7.00** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35** «Па сакрэцэ ўсяму свету».
**13.00** «У людзях».
**13.35** «Плюс-мінус».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.40 Серыял «Касатка». (12+).**
**17.15** «60 хвілін». Ток-шоу.
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.05 Серыял «Спаская» (12+).**
**23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15** Белавежская пушча (6+).
**6.30** «Гарады Беларусі» (6+).
**7.10** «Здароўе» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.20** «Справа ўрачоў» (16+).
**9.10 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**10.20** «Чакай мяне» (12+).
**11.15 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**13.20, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.50 Серыял «Высокія стаўкі» (16+).**
**16.20, 19.35, 22.40, 23.30** Сёння. Галоўнае.
**16.55** «ДНК» (16+).
**18.00, 19.50 Серыял «Мянтоўскія войны» (16+).**
**21.40 Серыял «Званар» (16+).**
**22.45** «НЗ.by».
**23.05, 23.45 Серыял «Вонкавае назіранне» (16+).**
**0.10 Дэтэктыў «Пляж» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.50, 18.00, 21.05, 1.45** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 16.00** «Мультпарад» (6+).
**7.30, 15.55, 20.45** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Флэш».**
**8.25 Серыял «Аднойчы ў Растове» (16+).**
**10.00** Дак. фільм.
**11.00** Глядзім усёй сям'ёй. «Гары Потэр. Дарункі смерці» (12+).
**13.15, 18.05 Серыял «Вядзьмак» (16+).**
**14.15 Серыял «Дзве зімы і тры леты» (16+).**
**16.25 Серыял «Зорны шлях» (12+).**
**19.15** «Суперлато».
**19.50 Серыял «Справа № 1» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (6+).
**21.10 Драма «Цёмныя воды» (16+).**
**23.15 Камедыя «Магія» (12+).**
**1.00 Серыял «Хадзячыя мерцвякі» (18+).**

# нядзеля, 11 кастрычніка

## ВТБ

**6.05** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.20** «Лаві момант» (16+).
**8.35** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**9.05** Мультфільм «Царэўны» (6+).
**9.25** Мультфільм «Скубі Ду» (6+).
**10.00** «Дзіцячы КВЗ» (6+).
**11.00** «Руская не смяюцца» (16+).
**12.00** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**12.50** Анімацыйны фільм «ANGRY BIRDS у кіно» (6+).
**14.40, 22.00, 0.20** «Уральскія пельмені» (16+).
**17.20** Жахі «Водмель» (16+).
**19.00** Баявік «Турыст» (12+).
**21.00** «Поўны блэкаўт» (16+).
**22.40** «Справа была вечарам» (16+).
**23.45** «Наш рамонт» (16+).
**2.05** «Проста кухня» (16+).
**2.35** «Рогаў у справе» (16+).
**3.25** Скетч-шоу «Даеш моладзь» (16+).
**4.40** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30** «Загадкавая планета». «Певень і фарбы». «Бюро знаходак». М/ф.
**7.40** «Звычайны чалавек». Маст. фільм [СЦ].
**9.15** «Звычайны канцэрт».
**9.45** «Мы — грамацеі!»
**10.25** «Боты ўсмятку». Маст. фільм [СЦ].
**11.50** Астравы. Валерый Носік [СЦ].
**12.30** Лісты з правінцыі. Сяло Меднае (Цвярская вобласць) [СЦ].
**13.00** Дыялогі пра жывёл. Заапарк Растована-Доне [СЦ].
**13.40** «Іншыя Раманавы». «Адважны воін Ма-чупан» [СЦ].
**14.10** «Гульня ў бісер».
**14.55, 1.25** «Дзяўчына на борце». Маст. фільм.
**16.30** Больш, чым каханне. Эдуард і Фарыда Валадарскія.
**17.10** «Пешшу...» Серпухаў купецкі [СЦ].
**17.35** «Уладар аркестра. Яўген Мравінскі». Дак. фільм.
**18.30** «Рамантыка рамансаў». Аляксандру Журбіну прысвячаецца...
**19.30** Навіны культуры.
**20.10** «Лізавета». Дак. фільм.
**21.05** «Беларускі вакзал». Маст. фільм [СЦ].
**22.45** Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра. Лучана Павароці ў оперы Дж. Вердзі «Аіда». Тэатр «Ла Скала».

## Настальгія

**6.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1964-ы. 1-я частка. 2011 год (12+).
**6.55, 8.40, 9.45, 11.00, 14.10, 17.10, 19.05, 20.40, 21.45, 23.35, 2.05, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.30** Маст. фільм «Адвойчы ў снежні» (16+).
**9.00, 21.00, 3.00** «Міну-лы час» (12+).
**10.00** «Колба часу».
**12.00** Маст. фільм «Пра Чырвоную Шапачку» (6+).
**15.00** «Быў час». 2008 год (16+).
**16.00** Тэлеспектакль «Альманах сатыры і гумару». 1980 год (12+).
**18.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**19.25** Маст. фільм «Людзі і манекены» (12+).
**22.00** Тэлеспектакль «Да новых сустрэч!» 1973 год (16+).
**0.00** Фільм-спектакль «Балалайкін і Ко». 1975 год (16+).

## EuroSport 1

**0.00, 23.30** Маўнцінбайк. Чэмпіянат свету (12+).
**1.00, 2.30, 7.00, 11.00, 12.25, 15.55, 20.00** Тэніс. «Ралан Гарос» (6+).
**2.15, 9.15, 12.10, 15.40, 19.30** Тэніс. «Ралан Гарос». «Гейм, Шэт і Матч» (6+).
**4.00** Веласпорт. Amstel Gold Race (12+).
**05.00** Веласпорт. «Джыра д'Італія» і Amstel Gold Race (12+).
**9.30** Аўтагонкі. WTCR (12+).
**21.00** Веласпорт. Гент — Вевельгем (12+).
**22.30** Тэніс. «Ралан Гарос». Агляд (6+).

## Кінакамедыя

**0.55** Ад сям'і не ўцячэш (16+).
**3.20** Робін Гуд (16+).
**5.50** Парк культуры і адпачынку (18+).
**7.50** Шпіён па суседстве (12+).
**9.35** Без заганы (16+).
**11.40** М/ф «Тры волаты: Ход канём» (6+).
**13.05** М/ф «Тры волаты і марскі цар» (6+).
**14.35** М/ф «Тры волаты і прынцэса Егіпта» (6+).
**15.55** М/ф «Тры волаты і спадчынніца прастола» (6+).
**17.30** Сужэнцы Морган ва ўцёках (16+).
**19.30** Кейт і Леа (12+).
**21.45** SuperЗяць (16+).
**23.40** Місія: неадэкватная (18+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.45** «Улегцы» (12+).
**8.15** «Дзяржаўная мяжа». Маст. фільм (12+).
**10.15** «Выратуйце, я не ўмею гатаваць!» (12+)
**11.05, 2.05** Серыял «Чыстая спроба» (16+).
**15.05** Анімацыйны фільм «Астэрыкс і таемнае зелле» (6+).
**16.45** Серыял «Агата і вышук. Каралева брыльянтаў» (12+).
**20.30** «ТБ3 вядзе расследаванне» (16+).
**21.35** «Асцярожна: ашуканцы!» (16+)
**22.15** «Сэрцаедкі». Маст. фільм (16+).
**0.35** «Візіцёры». Серыял (16+).
**5.20** «Без падману» (16+).

## ТБ1000

**6.35** Прадчуванне (16+).
**8.10** Рэпрадукцыя (16+).
**10.00** Фарсаж-4 (16+).



**11.50** Фарсаж-5 (16+).
**14.05** Фарсаж-6 (12+).
**16.25** Каратэ-пацан (12+).
**19.00** Шанхайскія рыцары (12+).
**21.00** Ніколі не здавайся (16+).
**23.05, 5.00** Накаўт (16+).
**0.35** Стагоддзе Адалін (16+).
**2.45** Госця (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**7.05** Ваўкадаў з роду Шэрых Сабак (16+).
**9.35** Яраслаў. Тысячу гадоў таму (16+).
**11.20** З дна вяршыні (16+).
**13.15** Іван Царэвіч і Шэры Воўк (12+).
**14.50** Іван Царэвіч і Шэры Воўк-2 (6+).
**16.05** Іван Царэвіч і Шэры Воўк-3 (6+).
**17.30** Іван Царэвіч і Шэры Воўк-4 (6+).
**19.00** На раёне (16+).
**20.45** Экіпаж (6+).
**23.10** Легенда № 17 (12+).
**1.25** Параграф 78: фільм першы (16+).
**4.20** Абаронцы (12+).
**5.50** Адрыў (16+).

## National Geographic

**6.00** Навуковыя глупствы (16+).
**7.35, 3.35** Аўта-SOS (16+).
**8.25** Машыны: разабраць і прадаць (16+).
**9.15** Егіпет з вышыні птушынага палёту (16+).
**11.00** Закінуты храм інкаў (16+).
**11.50** Інстынкт выжывання. Кітай (16+).
**14.20** Гарачыя межы: Лацінская Амерыка (16+).
**15.10** Служба бяспекі аэрапорта: Перу (16+).
**17.40** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**19.20** Моц племя (16+).
**21.00** Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
**0.20** Фабрыка ежы (16+).
**1.35** Зрабіць за адзін дзень (16+).
**2.00, 5.05** Асушыць акіян (16+).

## Discovery

**8.00** Махінатары (12+).
**8.45, 21.02** Як гэта ўладкавана: аўтамабілі мары (12+).
**9.10** Смяротны ўлоў (16+).
**10.00** Залаты шлях Паркера Шнабеля (16+).
**10.50, 5.42** Тайсан супраць акул (12+).
**11.41** Як уладкаваны Сусвет (12+).
**13.23, 23.09** Дальнабойшчык у Інданезіі (12+).
**14.14, 7.14** Паляўнічыя на дыназаўраў (12+).
**15.05** Браты Дызель (12+).
**19.20** Як гэта ўладкавана? (12+)
**20.11** Як гэта зроблена? (12+)
**21.27** Не спрабуйце паўтарыць (16+).
**0.00, 6.28** Вартавыя падземкі (12+).
**0.51** Олі Сміт: па слядах элю (16+).
**1.42** Паляўнічыя на старызну (12+).
**4.10** Паляўнічыя на склады (16+).

*У праграме магчымы змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*
*[СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

**6.30 Меладрама «Калейдаскоп лёсу» (16+).**
**8.20** Клуб рэдактараў (16+).
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал». (12+).
**9.45** Гісторыі выратавання (12+).
**10.40** «Зона Х». Вынікі тыдня (16+).
**11.15** Вакол планеты.
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35 Меладрама «Закон захавання кахання». 1-я і 2-я серыі (16+).**
**14.30** Маршрут пабудаваны (12+).
**15.15** Родныя людзі (6+).
**15.30** «1418 дзён. Гісторыя Перамогі». Дак. фільм (12+).
**16.10** Адзін дзень (12+).
**16.40, 19.10 Меладрама «Пачыва з прадказаннем» (12+).**
**20.35** Навіны надвор'я.
**21.00** Галоўны эфір.
**22.05 Меладрама «Прывітанне ад бусла». 1—4-я серыі (12+).**

## Беларусь 2

**6.55 «Не нарадзіся прыгожай». Серыял (12+).**
**08.40** М/с «Стыч!» (6+)
**9.25, 19.40** Тэлебарометр.
**9.30** «Да пабачэння» (16+).
**10.15** «Чалавек-невідзімка» (16+).
**11.15** «Свет навыварат. Бразілія» (16+).
**12.15 Прыгоды «Баявы конь» (12+).**
**14.40** «Тата папаў» (16+).
**17.05** «Вежа» (12+).
**17.55** «Бітва экстрасэнсаў» (16+).
**20.15** «Арол і рэшка. Марскі сезон» (16+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**21.20 Меладрама «Прыкінься маім хлопцам» (16+).**
**23.00 Драма «Трусіная нара» (16+).**

## Беларусь 3

**7.35** «Святыні Беларусі».
**8.00, 14.15, 20.20** Навіны культуры.
**8.20, 14.35** Гэты дзень.
**8.25 «Прыгажун і пачвара». М/ф (0+).**
**8.30 «Дача». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**10.00** «Наперад у мінулае».
**10.25** «Беларуская кухня». Зразы бульбяныя.
**10.55** «Нацыянальны хіт-парад».
**11.50 «Начное здарэнне». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**13.20** Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2019». «Зорны карагод».
**14.40 «Каханая жанчына механіка Гаўрылава». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**16.00** «Камертон». Народны артыст Беларусі Яўген Гладкоў.
**16.25 «Вазьму твой боль». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**17.50** В. Кузняцоў. «Анастасія». Балет Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі.
**19.30** «Кадры жыцця». Балерына, народная артыстка Беларусі Ірына Яромкіна.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Ясенін». Маст. фільм (16+).**

## Беларусь 5

**7.00, 12.50** Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. «Будаўнік» (Брэст) — ХК «Мінск».
**8.20** Футбол. Ліга Нацый УЕФА. Украіна — Германія.
**10.15** Тэніс. Ралан Гарос.
**12.20** Піт-стоп.
**14.25** Вось гэта спорт!
**14.40** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Унікса» (Казань) — «Цмокі-Мінск».
**16.30** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Дынама» (Рыга). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**18.55** Футбол. Ліга Нацый УЕФА. Літва — Беларусь. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**21.00** Футбол. Ліга Нацый УЕФА. Дзённік гульнявога дня.
**21.35** Футбол. Ліга Нацый УЕФА. Францыя — Партугалія. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**23.40** Вынікі тыдня.

## АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** [СЦ], **18.00** Навіны.
**7.15** «Здароўе» (16+).
**8.10** «Жыццё іншых» (12+).
**9.15** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**9.35** «Метэагід».
**9.55, 21.20 Маст. фільм «Фота на нядобрую памяць» (16+).**
**11.50** «Ці бачылі відза?» (6+)
**13.45** «На дачу!» (6+)
**15.00** Да юбілею Віктара Паўлава. «Паміж анёлам і нячысцікам» (12+).
**16.20** Святочны канцэрт (12+).
**18.20** «Тры акорды» (16+).
**20.00** «Контуры».
**23.15** «Спартклуб» (16+).
**23.35 Маст. фільм «Аднакласнікі» (16+).**

## СТБ

**6.35, 0.10** «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
**8.15** Дак. праект (16+).
**9.10** «Мінтранс» (16+).
**10.00** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.30** «Вялікі горад».
**11.00, 13.40, 20.50** Дак. спецпраект (16+).
**13.30, 16.30** Навіны «24 гадзіны».
**16.00, 16.40 «Трэцяга не дадзена». Серыял (12+).**
**19.30** «Тыдзень».
**22.45** «Засакрэчаныя спісы» (16+).

## МІР

**5.00 Серыял «40+, або Геаметрыя пачуццяў» (12+).**
**5.20** М/ф (12+).
**6.55 Маст. фільм «Чалавек з бульвара Капуцынаў» [СЦ] (16+).**
**8.50** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
Але ключавым фактарам для пашырэння магчымасцяў беларусаў можа стаць змяненне нарматыўных дакументаў Расіі, якія дадуць дазвол ВНУ залічваць вынікі цэнтралізаванага тэсціравання. Па словах эксперта, гэты працэс не хуткі, патрабуе мноства рашэнняў, але дазволіць значна прасунуцца ў адукацыйнай інтэграцыі.

**Георгій ТРУБНІКАЎ, першы віцэ-дырэктар Аб'яднанага інстытута ядзерных даследаванняў,** звярнуў увагу на словы Сяргея Рахманава, які прапанаваў не толькі ствараць новае, але ў першую чаргу развіваць дзеючыя практыкі ў супрацоўніцтве. Такім надзейным прыкладам спікер назваў праграмы Саюзнай дзяржавы, што ўяўляюць сабой інструмент для навуковай і адукацыйнай кааўрдынацыі патэнцыялаў краін. «Яшчэ адна ініцыятыва, якую мы прапаноўвалі, — развіццё праграм акадэмічных абменаў Расіі і Беларусі. Гэта стажыроўкі паміж інстытутамі, кароткатэрміновыя і доўгатэрміновыя візіты», — сказаў навуковец.

**Старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ,** які прысутнічаў на сесіі, расказаў аб захаванні памяці пра Вялікую Айчынную вайну ў гэтым рэгіёне і развіцці кантактаў з расійскімі партнёрамі. Асабліва ён адзначыў работу з Бранскай і Маскоўскай абласцямі.

Па выніках сесіі падрыхтаваны пералік прапаноў у выніковы дакумент VII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

**Марыя ДАДАЛКА.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

СЛОВА — УДЗЕЛЬНІКАМ

# Культурна-гістарычная спадчына — тое, што нас аб'ядноўвае

**У гэтым перакананна Галіна БЯЛЯЕВА, завуч школы № 34 г. Магілёва. На Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі яна назвала тыя кірункі, па якіх ужо вядзецца супрацоўніцтва, і прапанавала новыя формы ўзаемадзеяння.**



— Агульныя помнікі гісторыі, культуры і архітэктуры патрабуюць ад нас больш цеснага супрацоўніцтва. Прыкладам таго, як гэта важна і карысна, можна назваць стварэнне мультымедыйнай карты «Абарона Магілёва: 23 гераічныя дні». Гэта было зроблена пасля таго, як з'явіўся расійскі электронны рэсурс «Пераможцы, салдаты Вялікай вайны». Праект грандыёзны, цікавы, актуальны, але мы звярнулі ўвагу, што ў расійскай распрацоўцы падзеі на тэрыторыі Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны паказаны фрагментарна. Наша інтэрактыўная карта дазваляе прасачыць па днях прасоўванне нямецка-фашысцкіх войскаў па тэрыторыі Беларусі ў чэрвені—ліпені 1941-га і зразумець значнасць абароны Дняпроўскага рубяжа ў кантэксце Вялікай Айчыннай вайны. Сёння гэты электронны рэсурс выкарыстоўваецца ў навучальных установах Магілёўскай вобласці на факультатыўных занятках і ўроках гісторыі Беларусі, і мы гатовыя падзяліцца ім з расіянамі.

Яшчэ адзін прыклад таго, як мы шануем нашу агульную гісторыю, — гэта ўстаноўка магілёўскімі дэпутатамі памятнага знака на адным з рубяжоў гераічнай абароны Магілёва. Там разам з беларусамі ў першыя дні вайны насмерць стаялі байцы 110-й і 172-й тульскіх стралковых дывізій. Абарона Магілёва доўжылася 23 дні, і нямецкія танкі на гэтым участку так і не прайшлі. Беларусы памятаюць пра гэты подзвіг, нездарма Магілёў і Тула з'яўляюцца сёння гарадамі-пабрацімамі. Паміж сярэдняй школай № 34 Магілёва і Цэнтрам адукацыі № 40 Тулы вялося плённае супрацоўніцтва, мы абменьваліся меркаваннямі, праводзілі сумесныя педсаветы і навукова-практычныя канферэнцыі. Дзякуючы сувязям з установамі адукацыі Тулы і Масквы атрымалася аднавіць падрабязнасці подзвігаў старшага сяржанта артылерыі Мікалая Сірацініна ў ліпені 41-га пад Крычавам і разведчыка Івана Балуева ў кастрычніку 42-га ў Бялыніцкім раёне.

Было б карысна аб'яднацца для арганізацыі і правядзення сумесных дзіцяча-юнацкіх паходаў па мясцінах баявой славы, правядзення сумесных маладзёжных з'ездаў па адраджэнні і захаванні агульнай беларуска-расійскай спадчыны, аднаўлення агульных помнікаў гісторыі і культуры прыгранічных раёнаў Смаленскай, Бранскай, Магілёўскай абласцей. Пленнаму супрацоўніцтву вельмі будзе спрыяць наданне роўных магчымасцяў у рабоце з фондамі архіваў і музеяў грамадзянам Беларусі і Расіі, а таксама папулярызацыя тэматычных манаграфій.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Галіны БЯЛЯЕВАЙ.**

ЭКАНАМІЧНЫ РАКУРС

# ГІСТАРЫЧНЫ ШАНЦ

## Чаму голас бізнесу Беларусі і Расіі павінен быць і жорсткі, і звонкі?

**НЯГЛЕДЗЯЧЫ на спецыфічны фармат сёлетняга форуму, наладзіць сувязі на ім удалося і прадпрымальнікам. Каму, як не бізнесменам, якія заўсёды ў паездках і ў рэжыме шматзадачнасці, паказваць, як можна наладжваць кантакты на адлегласці? Такі прыклад яны далі на сумесным пасяджэнні дзелавых саветаў Беларусі і Расіі, што прайшло ў Беларускай гандлёва-прамысловай палаце.**




Па словах **старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзіміра УЛАХОВІЧА,** работа нацыянальных дзелавых саветаў дазваляе здымаць шмат канкрэтных праблем бізнесу. «У нас вялікі парадак дня, будуць разгледжаны такія пытанні, як зняцце існуючых абмежаванняў і бар'ераў, прызнанне электроннага лічбавага подпісу, банкаўскіх гарантый, пытанні прамысловай кааперацыі, лічбавізацыі эканомікі; важнае пытанне — сумеснае прасоўванне прадукцыі на рынкі трэціх краін», — адзначыў Уладзімір Улаховіч.

Ён з жалем падкрэсліў, што пандэмія прымусіла сустрэцца толькі ў відэафармаце, але ў беларускага бізнесу ёсць запыт да вяртання дзелавых кантактаў у нармальную, звыклую плынь выніковых сустрэч.

**Сяргей КАТЫРЫН, прэзідэнт Гандлёва-прамысловай палаты Расіі** канстатаваў, што гэта ўжо трэці форум, на якім ёсць пляцоўка для кантактаў дзелавога савета. «У нас ёсць нядрэнны зачын, на аснове якога мы можам працаваць далей. Мы не спыняліся сёлета. Я ўдзячны за гэта калегам. Мы правялі анлайн каля 20 мерапрыемстваў і пачалі прывыкаць да гэтага фармату», — заўважыў ён. Шмат, па словах Сяргея Катырына, змаглі зрабіць у супрацоўніцтве з Еўразійскай эканамічнай камісіяй, якая адгукалася на запыты бізнесменаў дзвюх краін.

Уладзімір Улаховіч заўважыў, што ўнікальнасць Форуму рэгіёнаў у магчымасці працаваць на мерапрыемствах сумесна з парламентарыямі, і даў слова **Таццяне РУНЕЦ, старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах.** Яна адзначыла, што заканадаўчыя органы — Савет Федэрацыі і Савет Рэспублікі — ведаюць аб праблемах бізнесу і будуць працаваць над гарманізацыяй эканамічнага заканадаўства для аднолькавых правілаў гульні.

**Андрэй КУЦЕПАЎ, старшыня Камітэта Савета Федэрацыі па эканамічнай палітыцы,** у сваю чаргу, падкрэсліў зацікаўленасць рэгіёнаў Расіі ў стварэнні ўмоў для кааперацыі і вытворчасці навукаёмістай прадукцыі. «Неабходна шырэй выкарыстоўваць новыя перспектывы для развіцця супрацоўніцтва нашых краін і рэалізацыі праектаў у галіне энергетыкі, экалогіі, інфармацыйных тэхналогій, садзейнічаць развіццю прамысловай кааперацыі, пашырэнню ўзаемадзеяння малых і сярэдніх прадпрыемстваў», — акцэнтаваў увагу сенатар. Ён дадаў, што адным з найважнейшых элементаў супрацоўніцтва рэгіёнаў Беларусі і Расіі сталі гандлёва-прамысловыя палаты. Яны фарміруюць спектр узаемных інтарэсаў у галіне эканомікі і маюць канкрэтную накіраванасць.

«Расія гатова да самага цеснага супрацоўніцтва з партнёрамі з Беларусі для забеспячэння ўстойлівага доўгатэрміновага росту нашых эканомік. Гатовыя разам выбудоўваць прамысловую і тэхналагічную палітыку, развіваць інфраструктуру», — завяршыў Андрэй Куцепаў.

Выступілі на пасяджэнні і прадстаўнікі бізнесу. Так, **генеральны дырэктар кампаніі «Санта Імпэкс Брэст» Аляксандр МАШЭНСКІ** аддаў першаступенную ўвагу пытанню маркіроўкі тавараў. У Расійскай Федэрацыі з 2021 года яна абавязковая для «малочкі» і прадугледжвае нанясенне на кожную адзінку тавару ўнікальнага кода. У сувязі з гэтым прадпрыемствы дзвюх краін панясуць выдаткі на пераабсталяванні вытворчых ліній і набыццё



кодаў маркіроўкі. Страты прадпрыемстваў будуць адлічвацца сотнямі мільёнаў долараў ЗША. Ён выказаў пазіцыю бізнесу, што коды маркіроўкі павінны быць бясплатныя для вытворцаў, і папрасіў падняць гэтае пытанне на ўзроўні ўлад.

Уладзімір Улаховіч дадаў, што тэхнічнае рэгуляванне сёння — ключавая тэма, якая ўплывае на развіццё інтэграцыйных працэсаў. І ў гэтай сувязі голас бізнесу павінен быць «і жорсткі, і звонкі».

**Дзмітрый МАЗЕПІН, старшыня Расійска-Беларускага дзелавога савета, кіраўнік савета дырэктараў «Уралхіма»,** быў адным з энтузіястаў па стварэнні пляцоўкі бізнес-кантактаў. З яго слоў, рабочыя групы бізнесменаў дзвюх краін функцыянуюць на рэгулярнай аснове. Адзначыў ён і пастаянную зацікаўленасць і актыўнасць пасла Беларусі ў Расіі Уладзіміра Сямашкі, які абмяркоўвае пытанні з прадстаўнікамі расійскага бізнесу. Ён расказаў, што работа дзелавога савета ажыццяўляецца ў зносінах з прадстаўнікамі расійскага ўрада. Цяпер, па словах Дзмітрыя Мазепіна, у кабміне Расіі прапрацоўваецца пытанне, як заахвоціць беларускіх калег больш актыўна выкарыстоўваць расійскія партовыя магутнасці.

«Я лічу, з-за таго, што многія міжнародныя сувязі зараз парушыліся, у Расіі і Беларусі ёсць гістарычны шанц паглыбіць інтэграцыю, каб гэта было выгадна абедзвюм краінам», — адзначыў Дзмітрый Мазепін.

Уладзімір Улаховіч заўважыў, што падымаць вострыя і балючыя пытанні на пляцоўцы савета для прадпрымальнікаў стала своеасаблівай традыцыяй. «Калі размовы ў нас будуць выключна пустыя, то, мабыць, і савет страціць свой сэнс. Гэта я чую ад нашых прадпрымальнікаў увесь час», — заявіў старшыня БелГПП і дадаў, што, акрамя поспехаў, ёсць у бізнес-асяродку і вялікі патэнцыял.

**Марыя ДАДАЛКА.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

### У тэму

Традыцыйна актыўныя ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі арганізацыі нафтахімічнага профілю.

Напрыклад, ТАА «Белнафтахім-РАС» выйшла на падпісанне кантрактаў на пастаўку прадукцыі арганізацый канцэрна «Белнафтахім» на агульную суму 61 мільён долараў. Пастаўкі будуць ажыццяўляцца як сёлета, так і ў наступным годзе. ААТ «Магілёўхімвалакно» заключыла кантракт з ТАА «Авангард» (г. Тосна) на пастаўку поліэфірнага валакна на суму 30 мільёнаў долараў.

Мінскі трактарны завод у рамках падрыхтоўкі да Форуму рэгіёнаў забяспечыў пастаўкі сваёй прадукцыі ў Расію на суму 17 мільёнаў долараў, ААТ «МАЗ» у верасні заключыла кантракты на пастаўку пасажырскай тэхнікі на суму 12 мільёнаў долараў.










Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

ВЫСТАЎКА

# Незабыўная атмасфера...

**ПАДЧАС работы тэматычнай секцыі «Подзвіг савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне — аснова выхавання патрыятызму і грамадскай адказнасці» ў дворыку і ў памяшканні НАН Беларусі разгарнулася інтэрактыўная выстаўка.**

Яе наведвальнікі маглі дзякуючы архіўным дакументам, фатаграфіям, кнігам і гістарычным артэфактам убачыць гераічны і пераможны шлях народа ў Вялікай Айчыннай вайне. На вуліцы разгарнулася экспазіцыя ваеннай тэхнікі таго перыяду, можна было зазірнуць у партызанскі штаб і камсамольскі лагер, пачаставацца смачнай салдацкай кашай.

У фае дзейнічалі выстаўкі, якія прэзентавалі розныя тэматычныя праекты. Напрыклад, электронны партал «Партызаны Беларусі», дзе ўжо сабраны імёны амаль ста тысяч герояў, якія набліжалі Перамогу не ў шэрагах дзеючай арміі.

Цікавы аказаўся і праект «Зорка на карце», дзякуючы якому створана інтэрактыўная карта з адлюстраваннем воінскіх пахаванняў і помнікаў, прысвечаных вызваленню нашай краіны. А выстаўка арыгінальных сцягоў Перамогі, якую зладзіў Дзяржаўны музей гісторыі Узброеных Сіл Беларусі, прыцягнула асаблівую ўвагу наведвальнікаў — не кожны дзень можна ўбачыць унікальныя палотнішчы, некаторыя з якіх былі ўзняты над рэйхстагам...

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# АЎТАМАБІЛІ, ДАРОГІ, СПАДАРОЖНІКІ

**Адмена роўмінгу мабільнай сувязі паміж Беларуссю і Расіяй, прэмія Саюзнай дзяржавы ў галіне навукі і тэхнікі, уніфікацыя заканадаўства, агульныя прэферэнцыі, прасоўванне сумеснай прадукцыі на рынак трэціх краін... Гэтыя і іншыя эканамічныя планы абмяркоўвалі ўдзельнікі VII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі на секцыі «Сумесныя праекты як фактар стабільнага эканамічнага развіцця Беларусі і Расіі» падчас анлайн-сустрэчы. На відэамост з расіянамі беларусы сабраліся ў Жодзіне на прадпрыемстве «БелАЗ».**



## Сумесны бізнес і эканамічная кааперацыя

Месца для абмеркавання менавіта эканамічных пытанняў форуму было абрана невыпадкова. Па-першае, вытворчасць кар'ернай тэхнікі ў Жодзіне — яскравы прыклад супрацоўніцтва краін. Па-другое, расіяне не выключаюць магчымасці рэалізацыі ў сябе вытворчасці беларускіх самазвалаў.

Больш за 8000 прадпрыемстваў абедзвюх краін звязаны прамысловай кааперацыяй. Сёння ў Беларусі працуе каля 2,5 тысячы прадпрыемстваў з удзелам расійскага капіталу, 1300 з іх — сумесныя. У Расіі 117 арганізацый з беларускім капіталам і 45 зборачных вытворчасцяў.



— Летась тавараабарот паміж нашымі краінамі склаў больш за 38,5 мільярда долараў, што займае 46 % ад усяго знешняга гандлю краіны. А за паўгоддзе 2020-га ў Беларусь прыцягнута з Расіі 320 мільёнаў долараў. Каля паловы сабекошту кожнага беларускага трактара, камбайна ці грузавіка прыходзіцца на расійскую сыравіну і камплектуючыя, — заўважыла **Таццяна РУНЕЦ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце, фінансам.** — Аднак большую ўвагу трэба аддаць рэалізацыі сумесных праектаў, стварэнню сумеснага бізнесу.

**Андрэй КУЦЕПАЎ, старшыня Камітэта Савета Федэрацыі па эканамічнай палітыцы** пагадзіўся, што доўгатэрміновыя інтарэсы краін і значны сумесны багаж супрацоўніцтва ў эканамічнай і сацыяльна-гуманітарнай галінах — аб'ектыўная канкурэнтная перавага.

— Ключавы напрамак — міжрэгіянальнае супрацоўніцтва. Каля 60 суб'ектаў Расіі маюць наладжаныя сувязі з Беларуссю. Цікавасць да інвестыцыйных праектаў стабільна расце, і органы ўлады гатовыя ўсебакова падтрымліваць падобныя ініцыятывы. Сярод асноўных кірункаў эканамічнай кааперацыі — сумесная вытворчасць і рэалізацыя машын і абсталявання.

Найважнейшыя інфраструктурныя элементы фарміравання адзінай эканамічнай прасторы Саюзнай дзяржавы абазначыў у сваім выступленні **Рыгор РАПОТА, дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы.** Да базавых элементаў існавання такой прасторы ён аднёс падобнасць (або розніцу) эканамічных мадэляў краін, развітасць кааперацыйных сувязяў, наяўнасць сумесных прадпрыемстваў на абедзвюх тэрыторыях, рост аб'ёму тавараабароту сумесна з ліквідацыяй гандлёвых бар'ераў, рэалізацыю маштабных прамысловых і энергетычных праектаў, развіццё інфраструктуры ў галіне транспарту, навуковае супрацоўніцтва і іншае.

— Розніца, што існуе ў эканамічных мадэлях краін, не дазволіла нам стварыць транснацыянальныя прамысловыя прадпрыемствы шляхам зліцця. Такі адмоўны вынік падштурхнуў да пряняцця некаторых прававых дакументаў, якія дазволяць зрабіць эканамічныя мадэлі больш падобнымі. Гэта гарманізацыя заканадаўчых працэдур, у прыватнасці падатковага заканадаўства, — агучыў дзяржсакратар. — Усе 12 праграм Саюзнай дзяржавы, якія рэалізуюцца, накіраваны на стварэнне інавацыйнага прадукту. Прынята рашэнне раз на два гады ўручаць прэмію Саюзнай дзяржавы ў галіне навукі і тэхнікі. Першую мяркуецца прысудзіць найлепшым ужо сёлета.

## «Мерыдыян», тэхнічны вуглярод і ліфты

Паміж краінамі рэалізуецца і распрацоўваецца і мноства іншых праектаў. Найважнейшае месца сярод іх займае будаўніцтва Беларускай АЭС. Да моманту яе выхаду на поўную магутнасць трэба прапрацаваць буйныя праекты, якія арыентаваны на энергаёмістую вытворчасць: металургія, нафтахімія, шкляная вытворчасць і выпуск электратранспарту, малатанажнага суднабудавання і камплектуючых да іх.

Дзяржсакратар згадаў, што ў Валагодскай вобласці (Чарапавец) і Татарстане, прынамсі, ужо выпускаюцца трактары маркі «Беларус». У Бранску збіраюць беларускія бульбаўборачныя камбайны. У Бранскай вобласці і Карэліі разварочваецца вытворчасць лесанарыхтоўчай тэхнікі беларускага прадпрыемства «Амкадор».

Немалаважнае значэнне маюць і транспартныя праекты. У прыватнасці будаўніцтва высакаскораснай магістралі працягласцю 2,5 тысячы кіламетраў, якая павінна злучыць Санкт-Пецярбург, Мінск, Варшаву, Гамбург. Прапрацавана бізнес-мадэль гэтай ідэі, і пры яе рэалізацыі дарога стане найбуйнейшай магістраллю на еўрапейскім кантыненце. У больш прасунутай стадыі знаходзіцца ідэя будаўніцтва аўтамагістралі «Мерыдыян», якая пройдзе праз Кітай, Казахстан, Расію і Беларусь. Задума з'явілася яшчэ дзесяць гадоў таму, аднак да мінулага года ў Расіі да яе будаўніцтва не прыступалі (цяпер рэалізацыю перадалі ў рукі прыватніка). Пры гэтым у Кітаі і Казахстане праект амаль цалкам рэалізаваны.

Міністэрствы сувязі Расіі і Беларусі, прынамсі, на сумесным пасяджэнні паабяцалі прынцыпова вырашыць пытанне адмены роўмінгу мабільнай сувязі паміж краінамі. Тэхнічна гэта, пэўна, зойме яшчэ нейкі час, падкрэсліў Рыгор Рапота.

Разглядаюць расіяне і магчымасць стварэння паглыбленай лакалізацыі па будаўніцтве дарожнай тэхнікі ў Бранску.

— Нам трэба вызначыць наменклатуру прадукцыі ўвогуле ва ўсіх сумесных праектах, вытворчасць якіх не лакалізавана на тэрыторыі Расіі ці Беларусі, — мяркуе **Віктар ЯЎТУХОЎ, намеснік міністра прамысловасці і гандлю Расіі.** — Добры прыклад сумеснай работы — вытворчасць ліфтавага абсталявання маскоўскім прадпрыемствам «Паветратэхніка» і «Магілёўліфтмашам». Мэта праекта — рэалізаваць тысячу сумесных ліфтаў па праграме рэнавацыі жыллёвага фонду ў Маскве і вобласці ў 2020—2021 гадах. (Пасля сёлетняга форуму, дарэчы, гэтыя прадпрыемствы падпісалі пратакол намераў па сумесным выпуску ліфтавых лябёдак. — **Аўт.**). Яраслаўскі маторны завод пастаўляе рухавікі для БелАЗаў, і беларускія калегі прапанавалі стварыць вытворчасць цяжкіх самазвалаў БелАЗ і ў Расіі.

Намеснік міністра прывёў таксама свежы прыклад прамысловай кааперацыі на тэрыторыі Беларусі — інвестпраект на больш чым 150 мільёнаў еўра з боку Расіі па стварэнні прадпрыемстваў па вытворчасці тэхнічнага вугляроду ў СЭЗ «Магілёў». Увод завода ў эксплуатацыю праз пандэмію ссунуўся, але ўжо ўвосень ён павінен запрацаваць.




— Аснова нашага супрацоўніцтва — міжвытворчая кааперацыя. Такім супрацоўніцтвам па ўзаемнай пастаўцы сыравіны, матэрыялаў і камплектуючых звязана больш як восем тысяч айчынных і расійскіх прадпрыемстваў, — падкрэсліў **Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК, намеснік міністра прамысловасці Беларусі.** — І можна ўпэўнена казаць пра значны патэнцыял для павышэння канкурэнтаздольнасці машынабудаўнічых галін абедзвюх краін. Важны кірунак супрацоўніцтва таксама — узаемадзеянне ў сферы высокіх тэхналогій і навацый. Сумеснае стварэнне высокаінтэлектуальнай прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю — прыярытэтны кірунак.

## Зварот інвестыцый і навуковыя прадукты

Беларуская прадукцыя прысутнічае практычна ва ўсіх расійскіх рэгіёнах, адзначалася на форуме, дзе ўдзельнічалі чатыры расійскія губернатары. За апошнія некалькі гадоў каля 600 беларускіх аўтобусаў, тралейбусаў і трамваяў пастаўлена ў Самарскую вобласць. Цяпер у Самары вопытна эксплуатуюцца айчынныя электробусы, прапрацоўваецца пытанне аб іх закупцы. У сваю чаргу «Лада» застаецца адным з лідараў беларускага аўтарынку. Летась АўтаВАЗ рэалізаваў больш за 16 тысяч машын і заняў першае месца на беларускім рынку, расказаў **Дзмітрый АЗАРАЎ, губернатар Самарскай вобласці.** Ён падкрэсліў, што давер застаецца самым каштоўным у партнёрстве і выказаў спадзяванне на «стварэнне ўзаемных прэферэнцый і далейшую сумесную работу па падтрымцы паставак аўтамабіляў і камплектуючых на ўзроўні міжурадавых дагавораў і стымуляцыйных праграм».

— Міністэрства прамысловасці Расіі прапрацоўвае дадатковыя праграмы, у тым ліку па вяртанні інвестыцый інвестарам, якія будуць размяшчаць аўтакампанентныя прадпрыемствы і лакалізаваць іх на тэрыторыі вобласці, — дадаў ён.

Маштаб сумесных распрацовак дзвюх краін па праграме Саюзнай дзяржавы ў навуковай галіне акрэсліў **Пётр ВІЦЯЗЬ, кіраўнік апарату Нацыянальнай акадэміі навук.** Ён расказаў, напрыклад, пра стварэнне вопытнага ўзору тамографа, імпульснага фотаімульсійнага тэрмометра для бескантактавага вымярэння высокай тэмпературы, інфармацыйнага вымяральнага камплекта для ацэнкі якасці пакрыцця ракетна-касмічнай тэхнікі, сістэмы дыстанцыйнага зандзіравання зямлі і шмат іншых цікавых вынаходніцтваў.

— Мяркуецца гарманізаваць 60 стандартаў. З іх 39 расійскім бокам, 29 — беларускім. Будзе распрацавана 18 сумесных арганізацыйна-метадычных дакументаў. Асаблівую ўвагу аддаём развіццю супрацоўніцтва з рэгіёнамі, куды актыўна пастаўляем прадукцыю, якая ствараецца ў Акадэміі навук. Нам сёння вельмі важна не толькі ствараць вопытныя ўзоры, але і рабіць сумесныя прадпрыемствы. І найбольшая работа ў гэтым кірунку зроблена з Раскосмасам. Мы перайшлі да стварэння сумеснага спадарожніка. Ужо распрацаваны яго эскізны праект з раздзяленнем 0,35 метра.

Вучоны заклікаў падтрымаць гэты кірунак, каб у найбліжэйшы час перайсці непасрэдна да вырабу спадарожніка.

З расійскага боку **выконваючы абавязкі губернатара Калужскай вобласці Уладзімір ПАЦЁМКІН** папрасіў беларускія кампаніі дапамагчы сёлета ў рэалізацыі нацыянальнага праекта «Жыллё і гарадское асяроддзе», у межах якога расіяне да 2024 года павінны будаваць не менш як адзін метр квадратны на кожнага жыхара Калужскай вобласці:

— Цяпер рэалізуецца больш за 130 жыллёвых праектаў ва ўсіх раёнах вобласці. Пры гэтым увага аддаецца якасці жылля і прымяненню інавацыйных эканамічных тэхналогій. І беларускія калегі ў гэтым плане надзейныя і адказныя партнёры.

Удзельнікі форуму ўпэўненыя, што ва ўзаемаадносінах паміж дзяржавамі назапашаны вялікі станоўчы вопыт у розных сферах і выказваюць надзею на захаванне гэтага патэнцыялу.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**




АНОНС

# ЗА адзіную!

**У суботу, 3 кастрычніка, адбудзецца маштабны аўтапрабег праз усю тэрыторыю Рэспублікі Беларусь — ад усходняй мяжы да заходняй.**

Як паведамілі арганізатары, на досвітку калона аўтамабіляў з дзяржаўнымі сцягамі пачне рух ад мяжы з Расійскай Федэрацыяй. Маршрут аўтапрабегу пралягае па самай значнай магістралі на тэрыторыі Беларусі, якая злучае Еўрапейскі саюз і Расію, — па трасе М1/Е30.

Асаблівасцю гэтага прабегу стане не толькі вялікая працягласць і значнасць маршруту, але і тое, што да асноўнай калоны на ўсім працягу прабегу будуць далучацца калоны аўтамабіляў з усіх найбліжэйшых гарадоў.

Фінальным пунктам прабегу стануць заходнія вароты Беларусі — Брэсцкая крэпасць-герой — месца, дзе словы пра патрыятызм і адданасць сваёй Радзіме маюць асаблівы сэнс.

ПАРАДАК ДНЯ — 2030

# НАСУСТРАЧ БУДУЧЫНІ, ЯКУЮ МЫ ХОЧАМ

## У Мінску прайшоў медыяфестываль «Галасы маладых за ўстойлівае развіццё — 2020»

**РАЗУМЕННЕ ўстойлівага развіцця як прынцыпова новага этапу жыцця чалавечай цывілізацыі дапамагае па-новаму зірнуць на ролю адукацыі ў рэалізацыі ідэй глабальнай і нацыянальнай бяспекі, эканамічнай устойлівасці, экалагічнай цэласнасці і сацыяльнага дабрабыту ўсіх і кожнага. Яскравым доказам гэтаму стала правядзенне ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка медыяфестывалю «Галасы маладых за ўстойлівае развіццё — 2020».**

— Медыяфестываль быў уключаны ў план мерапрыемстваў Савета па ўстойлівым развіцці на 2020—2021 гады і з'яўляецца часткай маладзёжнай кампаніі «Насустрач будучыні, якую мы хочам», што праходзіць у Беларусі у межах святкавання 75-годдзя ААН, — патлумачыла **начальнік каардынацыйнага цэнтра «Адукацыя ў інтарэсах устойлівага развіцця» БДПУ Інеса ЗУБРЫЛІНА.**

Як адзначыла суразмоўніца, ва ўніверсітэце аддаецца вялікая ўвага асваенню будучымі педагогамі кампетэнцый у галіне ўстойлівага развіцця і ўсведамлення іх ролі як патэнцыйных мультыплікатараў ідэй і прынцыпаў устойлівага развіцця сярод навучэнцаў, бацькоў і калег-педагогаў.

— Паміж нашым універсітэтам, Міністэрствам адукацыі і Офісам Пастаяннага каардынатара ААН у Рэспубліцы Беларусь сёлета ў сакавіку быў падпісаны план мерапрыемстваў маладзёжнай кампаніі «Насустрач будучыні, якую мы хочам», — падкрэслівае Інеса Зубрыліна.

На медыяфестываль прыехалі навучэнцы, студэнты і выкладчыкі розных устаноў адукацыі практычна з усіх рэгіёнаў краіны.



Да таго ж да анлайн-фармата далучылася вялікая колькасць удзельнікаў. Па выніках экспертнай ацэнкі да публічнага прагляду і былі рэкамендаваныя 19 з 43 заяўленых работ. Экспертная група ўсебакова змагла ацаніць і адабраць самыя цікавыя відэасюжэты для сумеснага абмеркавання ўдзельнікамі медыяфестывалю.

Намінацыя «Будучыня, якую мы хочам: ААН-75» была звязана з адным з самых маштабных у гісторыі глабальных абмеркаванняў, пачатак якому паклаў Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш, — абмеркаваннем будаўніцтва той будучыні, якой бы нам хацелася. І згаданая намінацыя стала яшчэ адным голасам гэтай дыскусіі, у яе рамках была прадэманстравана работа каманды сярэдняй школы № 40 Гродна з сугучнай назвай «Будучыня, якую мы хочам».

Лагічным працягам дыскусіі стала намінацыя «Насустрач новай эпохі Зямлі». Прэамбула тэксту Хартыі Зямлі пачынаецца словамі: «Мы жывём у пераломны момант гісторыі Зямлі: час, калі чалавецтва павінна абраць сваю будучыню». Але трэба памятаць, што прымусіць змяніць свае маральныя перакананні і перааценіць каштоўнасці амаль немагчыма. Доказам гэтаму сталі прадстаўленыя ў намінацыі работы «Хартыя Зямлі +20» (СШ № 3 Оршы) і «Навіны «Зялёная пятніца» (СШ № 14 імя Я. М. Фаміна Брэста).

Кожны з нас разумее, што існуючыя мадэлі паводзін чалавека патрабуюць кардынальных крокаў у рэчышчы задач, звязаных з адаптацыяй чалавека да кліматычных змен. Пошуку спосабаў гэтай адаптацыі былі прысвечаны работы намінацыі «Клімат змяняецца. А ты?»: «Падарожжа ў часе» (прадстаўлены студэнцкім саветам інжынернага факультэта Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта), «Шлях сапсаванай таблеткі» (СШ № 3 Пінска) і іншыя. Падчас абмеркавання ўдзельнікі адзначылі, што найлепшы спосаб прыцягнення ўвагі да праблемы кліматычных змен і ўключэння асяроддзя ў дыскусію — гэта расповед праз уласную гісторыю, рэальныя факты і непадробную зацікаўленасць да аб'екта абмеркавання.

Аўтарам відэасюжэтаў, заяўленых у намінацыі «Раскажы пра Мэты Устойлівага Развіцця (МУР)», трэба было на прыкладзе сваіх праектаў і ініцыятыў «перавесці» складаныя паняцці ўстойлівага развіцця на мову, зразумелую розным катэгорыям людзей. Дасягнуць устойлівых перамен можна толькі сумеснымі намаганнямі, нікога не пакідаючы ўбаку. Гэта вядучы прынцып інклюзіі, і абыйсці такую тэму было немагчыма. У намінацыі «Беларусь інклюзіўная» было прадстаўлена пяць работ, аўтары якіх выдатна адлюстравалі галоўныя прынцыпы, якімі кіруецца выкананне і дасягненне МУР: нікога не пакінуць убаку; універсальнасць; узаемасувязь і непадзельнасць; павага правоў чалавека.

У намінацыі «Мы — агенты ўстойлівых перамен» таксама было заяўлена пяць работ. Пры іх абмеркаванні ўвага скіроўвалася на фактычныя, сапраўдныя, рэальныя прыклады змен, да якіх мы імкнёмся і якіх самі спрабуем дасягнуць, і іх практыкаарыентаванасць.

Трэба сказаць, што ўсе ўдзельнікі медыяфестывалю атрымалі дыпломы лаўрэатаў і прызы ад Офіса Пастаяннага каардынатара ААН у Рэспубліцы Беларусь.

А вось прыз глядацкіх сімпатый па выніках анлайн-галасавання атрымала каманда «Рука ў руцэ» Жамчужненскай сярэдняй школы Баранавіцкага раёна. Спецыяльнага прыза ад БДПУ ўдастоены Студэнцкі савет факультэта педагогікі і псіхалогіі Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Спецыяльныя прызы ад Каардынацыйнага цэнтра «Адукацыя ў інтарэсах устойлівага развіцця» БДПУ ўручаны прадстаўнікам камандаў «Агенты сацыяльнай майстэрні» СШ гарпасёлка Краснаполле, «Эка-дзеці Палесся» СШ № 3 Пінска, «Разам» СШ № 40 Гродна і «Школа руплівых гаспадароў» СШ № 12 гэтага ж абласнога цэнтра.

— Работы лаўрэатаў медыяфестывалю «Галасы маладых за ўстойлівае развіццё — 2020», дапрацаваныя з улікам заўваг экспертаў, будуць паказаны на пасяджэнні тэматычнай дыскусійнай пляцоўкі «Насустрач будучыні, якую мы хочам: маладзёжная пазіцыя» падчас III Міжнароднага сімпозіума «Адукацыя ў інтарэсах устойлівага развіцця для ўсіх пакаленняў — сацыяльны дагавор», правядзенне якога запланавана сёлета ў БДПУ з 2 да 3 снежня, — рэзюмавала Інеса Зубрыліна.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 1 кастрычніка 2020 года.




## З ЛЕСУ ГРЫБОЎ НЕ ВЫБЕРАШ...

У слова «многа» сінонімаў шмат. Ну вось наўскідку, як той казаў: безліч, па вушы, дай божа, бачана-нябачана, ні канца ні краю, да гібloты, да халеры, цьма-цьмушчая, навалам, як сабак... Адсюль жа — хоць касу закладай і хоць вазамі вазі, што, згадзіцеся, часта ўспамінаецца ў добрую восень і якраз тады, калі размова ідзе пра лес і грыбы, пра так званае ціхае паляванне.

...На яго ў той год настойліва клікаў кум — хросны бацька маіх дзяцей. Грэх было не адгукнуцца, не ўзяць з сабою сяброў.

Словам, аднойчы рана-раненька ўсім кагалам мы прыехалі ў сапраўдную глыбінку ці нават глухмень.

(Спадзяюся, што ку́ма слова гэтае не пакрыўдзіць, бо вёска, дзе ён жыў і, дзякаваць богу, жыве (назву засакрэчу, бо які ж грыбнік выдае свае месцы?), знаходзіцца на мяжы Аршанскага і Сенненскага раёнаў і мы, даехаўшы туды на дызелі, яшчэ сем вёрст ішлі пехатой).

Але ж дарогу тую неяк агаралі і ў кума адразу ж паселі за стол: гаспадар сказаў, што ў лес ісці ранавата, бо росна пакуль, да таго ж «без сугрэву» там можна прастыць...

Такім чынам на стале з'явілася пляшка вядомага «сельгаснапою», глынуўшы якога, мы, павесялелыя, пабралі кашы і рушылі ў апенькі.

Трэба сказаць, што на маёй радзіме, на Міншчыне, гэтыя грыбы, як і розныя там кабылкі-сыраежкі, тады зусім не цаніліся. Мой бацька, у прыватнасці, іх наогул не браў: кашамі насіў баравікі — па дзвесце, па трыста штук. Прычым не абы-якіх, а крамяных, з цёмна-карычневымі шапкамі, з тоўстымі высокімі ножкамі...

Але ж у гасцях гаварыць пра гэта ды носам круціць нам з жонкай не выпадала: апенькі дык апенькі.

На ўскрайку лесу іх было зусім няшмат, затое потым... Адзін нейкі пень абрэжаш — кошык грыбоў. За ім — глядзіш — другі, трэці... І яно ж, далібог, праўду кажуць, што чым больш у чалавека грошай, тым больш іх хочацца. Тое ж самае і з грыбамі, хоць сабе і з апенькамі...

Праз нейкую гадзіну-другую мы запоўнілі ўвесь свой пасудак. А далей і зусім разгубіліся: дайшлі да невялікай балацінкі, зарослай травой, а ступіць на яе проста не можам, бо там усюды апенькі — прыгожыя, пругкія — хоць ты іх сырыя еш!.. Каб пазбіраць, нашы жанчыны паздымалі хусткі, мы — курткі, потым пайшлі кофты, сарочкі...

— Стойце, адпачніце крыху, — загадаў нам урэшце кум. — Я зараз, я мігам, адна нага тут...

І сапраўды ён хуценька знік (сігануў у бок дому), і гэтак жа хутка аб'явіўся: з-за кустоў мы пачулі вясёлае «ф-р-р», пасля якога з пярыжэлага вецця паказалася галава... каня. Ён тады хіба што лічыўся калгасны, а калі па праўдзе — быў, як кажуць, у кума ва ўласнасці, бо жонка яго працавала малаказборшчыцай, а сам ён развозіў па вёсках газавыя балоны.

Такім чынам далей мы збіралі грыбы ўжо ў... мяшкі, поўныя састаўлялі іх на калёсы і тым самым стваралі карціну, безумоўна ж, вартую пэндзля мастака! Ну ўявіце: конь цягне воз, а на ім — поўныя мяшкі і кашы — прычым не з нейкай там банальнай бульбай, а з сапраўднымі дарункамі лесу — з грыбамі.

...Кажуць, што сёлета яны таксама ўрадзілі. Дык мо пахваліцца хто з чытачоў «Звязды», што вазіў іх вазамі, бо я нічога падобнага болей не тое што не бачыў, — нават не чуў.

**Мікола Камароўскі,**

*г. Орша.*

## ЛЮБІЎ ЦАЛАВАЦЬ — ЛЮБІ І КАЛЫХАЦЬ

Гісторыя гэта даўняя-даўняя, але што праўдзівая — факт.

Значыць, адзін хлапчына ў хуткім часе пасля вайны скончыў курсы трактарыстаў, завербаваўся ў Сібір, папрацаваў там, потым адслужыў у войску (ды ў самой Маскве!). А далей — вярнуўся дамоў у родную вёску і там жа хацеў застацца. Але ў калгасе тады амаль нічога не плацілі, таму ні трактарыстам, ні шафёрам ён працаваць не стаў, — уладкаваўся ў школу загадчыкам гаспадаркі. «Пусцілі казла ў гарод», — казалі з гэтай нагоды вяскоўцы, бо ў школе тады і настаўніц маладых, і тэхнічак многа было... А ён жа, як той казаў, першы хлопец на вёсцы, бо і да працы ахвочы, і танцор, якіх пашукаць, і бывалы, і гумарны... Да таго ж сам падраманітаваў дабітую школьную «палутарку» (падарунак вайскоўцаў), давёў да ладу гэткі ж старэнькі матацыкл з каляскай... І гойсаў на іх ну вельмі шмат! Некага па справах падвозіў, некага катаў... Ахвотных (у тым ліку дзяўчат) хоць заваліся было: злятаецца, як тыя пчолкі на мёд. Ён нікога не адганяў...

І настаўніцы, трэба сказаць, больш гордыя аказаліся — з імі неяк абышлося. А вось тэхнічкі дзве — тыя «дакаталіся». Адна за нялюбага замуж пайшла, каб сорам прыкрыць, другая, да апошняга, відаць, на нешта спадзявалася: «уціскала» жывот і такім чынам рыхтавала сюрпрыз — нават роднай маці... Тая, гаротніца Марфа, неяк да фельчара ляціць ды крыкма крычыць:

— Роды ў мяне! Роды ў мяне!

— Дык чаго ты бегаеш? — пытаецца той. — Ідзі кладзіся...

На Зіначку, на Марфіну дачку, ён нават не падумаў: аніякага жывата ў дзеўкі не было — хіба скура ды косці...

Факт, што ўспамінаючы той дыялог, людзі ў вёсцы доўга смяяліся.

А вось у сям'і парадзіхі, вядома ж, не да смеху было. Гаспадар, Марфін муж, на фронце прапаў без вестак. Адпаведна, жонцы ані пенсіі якой, ані дапамогі. Меншых дзяцей чым хочаш кармі, у што хочаш адзявай. А тут ні села, ні пала, яшчэ і большае з дзіцем...

Марфа з таго гора спрабавала і з «хадаком» гаварыць, і з яго раднёй. Упрошвала, бедная, каб ажаніўся, каб гадаваў сваю дачушку. Толькі хлопец той — нават не падумаў. Сказаў: «Не я за вашай Зінай бегаў, а Зіна за мной... Што хацела яна, тое і атрымала. Значыць, няхай і гадуе».

Такі ён вынес прысуд. Думаў, мусіць, што сам дык чысценькі застанецца. Але ж не, па-іншаму атрымалася.

...У вёсцы той хто-ніхто вырошчваў чырвоны стручковы перац. А ўжо што пякучы, — дык проста жах. Нехта з яго прыпраўы да кілбас ды мяса рабіў, нехта — настойкі для націранняў...

Марфа таксама перцам разжылася, праўда, для іншых мэт: вёска ведала, што хадок той любіць у лазні парыцца. У першы дух, маўляў, на верхні палок узбярэцца, ляжа там, як на пляжы, на жывот ды яшчэ і ногі ўверх задзярэ, каб у пяты запякло...

Вось Марфа і сцяміла: тыя дошкі на палку нацерла пякучым перчыкам... І шчодранька — ну, як толькі магла!

Факт, што зяць (няспраўджаны) лёг, знячэўку яшчэ трохі паёрзаў, а далей...

Галяком, з крыкам-ровам, у рэчку, у халодную ваду...

Але ж і там паратунку не меў — як ні абмываўся...

Пасля гэтага, казалі, на дзевак ды маладзіц нават паглядзець не мог: ці то перац «не пускаў» (нагадваў, каб не лазіў, куды не трэба), ці то сорамна было, бо ўрэшце не вытрымаў ён насмешак, з'ехаў на цаліну ды недзе там і асеў.

А дачушка яго, тая Зініна дзяўчынка, трэба сказаць, харошым чалавекам вырасла, вучонай стала: байструкі — пазашлюбныя дзеці — яны часта далёка ідуць.

**Любоў Чыгрынава,**

*г. Мінск.*

## ВОСЬ ТАКАЯ МІТУСНЯ

Узорам ведання роднай мовы для нас, журналістаў раённых газет, заўсёды была (ды і засталася) газета «Звязда». Безліч разоў, ігнаруючы слоўнікі, мы звярталіся да яе па дапамогу, каб адшукаць найбольш дакладнае, сваё, беларускае слоўца. Не раз выручала газета і ў складаных, нават анекдатычных, выпадках.

Адзін з іх адбыўся ў тыя часы, калі пра інтэрнэт нават почуту не было: усю патрэбную інфармацыю людзі шукалі ў іншых крыніцах. Дык вось аднойчы нам трэ было анансаваць харошы фільм, які па-руску называецца «Суета сует». Па-беларуску значыць...

Калега, які рыхтаваў рэкламу, доўга не думаў — напісаў «Мітусня мітусінь», што, вядома ж, няправільна. А правільна як?

Адшукаць што-небудзь у слоўніках нам не ўдалося: там *«суета»* — мітусня, і болей амаль нічога. Прапанову даць назву кінафільма па-руску рэдактар таксама адмёў: сказаў, што лёгкіх шляхоў мы шукаць не павінны. Значыць, трэба хадзіць цяжкімі?

Адна галава добра, а некалькі, як вядома, лепш. У выніку ў нас з'явілася ці не з дзясятак «мудрых» прапаноў: «Мітусня мітусенў», «Мітусня мітусінняў», «Мітусня вакол мітусні», «Мітусня з мітуснямі» і г. д.

У працэсе іх «нараджэння» мы смяяліся, можна сказаць, да ікаўкі. І, напэўна б, доўга, калі б час не падганяў, калі б не трэ было ў друкарню нумар здаваць, прычым тэрмінова.

Таму ўрэшце некаму з нас прыйшла геніяльная думка — глянуць, а як жа гэтую назву падае «Звязда»? Спехам кінуліся да падшывкі, пагарталі — і, на шчасце, нам пашанцавала: досыць хутка знайшлі там адно кароткае слова: «Мітусня»! І ўсё!..

Гэткі ж варыянт дала тады і наша газета. А мы, яе супрацоўнікі, для сябе зрабілі выснову, што не заўсёды трэба мітусіцца, спяшаць перакласці кожную ідыёму або прымаўку ці шукаць для яе адпаведнік. Яго ў іншай мове можа проста не быць.

**Анатоль Палынскі,**

*г. Беразіно.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

### Неасабісты суб'ектыў



# ЦАНА АДЗІНОТЫ І ШКЛЯНКІ ВАДЫ

Колькі ні папярэджвай, а сезонныя махляры ўсё адно «ў шакаладзе». Чаму так?

ПАВОЛЬНА, размятаючы па баках першае апалае лісце, па доўгай вясковай вуліцы сунуліся лядашчыя цёмна-сінія «Жыгулі». Дзіўна было іх бачыць — у нашай вёсцы ўжо ні ў кога такога ламачча няма. «Мо цыганы? — падумалася. — Ды не, яшчэ рана». Але, калі машына спынілася акурат ля нашай хаты (пэўна, згледзелі жывыя кветкі на вокнах, якія мы яшчэ не паспелі забраць у горад, — сведчанне таго, што хтосьці жыве тут пастаянна) і брамку па-гаспадарску адчыніла кабета ў доўгай спадніцы, сумненні рассеяліся. Рванула з хаты як была — у тапках, грозна гукнула насустрач няпрошанай госці: «Што трэба?». Тая ідавочна разгубілася, прамямліла нешта пра танныя тавары, якія хоча прадаць, але сказана гэта было цераз плячо, бо «прадавачка» ўжо шпарка крочыла назад да брамкі. Я ведаю дакладна, што яе збянтэжыла і прымусіла так хутка рэціравацца, — зусім не мая няветлівасць, а мой узрост. Калі б насустрач выйшла бабуля, выставіць за падворак бесцырымонную маладзіцу было б нашмат складаней. А тут у «гандляроў» аблом атрымаўся. Не толькі са мной — праз паўгадзіны «Жыгулі» ўжо на добрай хуткасці бразгаталі па вуліцы назад. Яно і не дзіва — выхадны дзень, ды яшчэ і надвор'е добрае — поўная вёска людзей.

Але яны — калі не гэтыя дакладна, дык іншыя, абавязкова вернуцца. Бо надыходзіць іх час — з ранніми прыцемкамі, пустымі вуліцамі і адзінокімі пенсіянерамі ў хатах, у якіх, акрамя тэлевізара, ката на каленях ды рэдкіх размоў з гарадскімі дзецьмі-ўнукамі па тэлефоне, і забаўкі больш на ўвесь доўгі вечар і кароткі дзень няма. Хай сабе і цыганы — хоць які чалавек брамку за дзень адчыніць. Зрэшты, «цыганы» — гэта так, па прывычцы кажуць. На самай справе ў гэты «бізнес» уцягнутыя абсалютна розныя людзі, і ўжо не ўгадаеш, якой яны нацыянальнасці. Махляры — вось такое ў іх і пакліканне і нацыянальная прыналежнасць.

І кожны год адно і тое ж. Колькі ні папярэджвае міліцыя, колькі ні расказваюць жыццёвых гісторый пра абдураных і абакрадзеных пенсіянераў — усё роўна статыстыка злачынстваў штогод выдае новую фактуру. І «гандляры» на старых задрыпаных машынах як ездзілі гадоў дваццаць назад па вясковых вуліцах, так і ездзяць. І асартымент для продажу ў іх той жа — «пасцельнае», якое рвецца пад пальцамі, не дажываючы да першага мыцця; люраксавыя кофты кіслотных колераў; трыкатажныя штаны, што пасля аднаго адзявання расцягваюцца, як рэзгіны; кардонныя туфлі, што развальваюцца проста на нагах; нейкая нікому не патрэбная гаспадарчая трасца ккталту даставальніка костачак з вішань (які ад вішні ў найлепшым выпадку пакідае толькі скамечаную скурку). Здавалася б, хто гэта купляе? Купляюць — тыя ж самыя пенсіянеры. А яшчэ, калі пашанцуе, можна зайсці ў хату і папрасіць шклянку вады. І пад шумок знайсці і выграбці ўсе грошы, што гаспадар ці гаспадыня збіралі на чорны дзень. (Іх і шукаць нескладана, яны ж і сёння ляжаць або ў шафе пад бялізнай, або на ложку пад матрасам, праўда?) Бізнес рызыкоўны, але даволі прыбытковы. Інакш хто б ім з такім упартым пастаянствам займаўся...

ГАДОЎ дваццаць назад падобныя «гастралёры» ў суседняй вёсцы ўкралі ў адной бабулі ўсе яе «пахавальныя» грошы. Працавалі па простай схеме: паказалі тавар, папрасілі папіць вады. Гаспадыня запрасіла іх у хату, прапанавала нешта і перакусіць. Добрая гандлярка за гэта расшчодрылася — танна вырашылі прадаць бабцы фірменны электрачайнік. Пакуль адна дэманстравала і красамоўна распісвала «цуд японскай тэхнікі», іншая, схапіўшы са стала прапанаваны бутэрброд, употай паспела палазіць па бабчыных схованках і пазабіраць адтуль усе наяўныя грошы. Даверлівая гаспадыня засталася і без зберажэнняў, і без чайніка, якога так і не купіла.

Гэту гісторыю доўга пераказвалі па ўсім наваколлі. Гаварылі і пра даверлівасць старой, і пра няўважлівасць да яе дзяцей, якія, жывучы ў недалёкім горадзе, рэдка да яе прыязджалі... Бабулі той ужо даўно няма на свеце, у яе хаце цяпер жыве дачка, якая пасля выхаду на пенсію пакінула кватэру сваім маладым. Якім жа летась было маё здзіўленне, калі, апынуўшыся ў той вёсцы позняй восенню, я ўбачыла каля іхняй хаты парэпаную машыну і гаспадыню, якая вяла гандлярак да доўгіх спадніцах да сябе ў хату...

Чым скончыўся іх «візіт» — невядома, прынамсі, у нас нічога пра тое не казалі. Можа, кабета проста купіла кофту з люрэксам, з якой гэты люрэкс праз два тыдні павылазіў, — але для кагоў вёсцы гэта навіна? Можа, выгнала гандлярак з гвалтам — і гэта не навіна таксама. А можа, выцягнулі штосьці і з яе шафы. Але яна пра тое саромеецца расказваць, бо зразумела нарэшце, чаму яе маці была як пад гіпнозам, чаму запрасіла ў хату чужых, незнаёмых людзей. Бо да яе, «маладой» гаспадыні, дзеці, кажуць, таксама зусім нячаста ездзяць дый нават звоняць рэдка...

ДА Дня пажылых людзей, які ва ўсім свеце адзначаецца 1 кастрычніка, нашымі ведамствамі была агучана раснастайная статыстыка па тэме. Мяне зачапілі дзве лічбы. З пачатку года ў дачыненні да пажылых людзей было здзейснена 130 ашуканстваў. З амаль 100 тысяч пажылых беларусаў, якія атрымліваюць сацыяльныя паслугі дома, 80 працэнтаў апошнія аплочваюць. Гэта значыць, што яны не адзінокія, у іх ёсць працаздольныя дзеці. Хачу памыляцца, але пры такім раскладзе першая лічба будзе толькі расці. Асабліва позняй восенню гэта статыстыка нязменна будзе павялічвацца.

Паспрабуйце са мной паспрачацца. Але спачатку спытайце ў саміх сябе, ці званілі вам сёння вашы дзеці або ці званілі вы сёння сваім пажылым бацькам. Апраўданні накшталт «няма часу» ні пры якіх умовах тут не прымаюцца.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

Надвор'е

# КАСТРЫЧНІК СТАНЕ ВЕРАСНЕМ?

**«Па тэмпературным рэжыме верасень на значнай частцы тэрыторыі Беларусі прайшоў у кліматычных рамках жніўня. Кастрычнік, паводле прагнозу, у плане надвор'я спрабуе замяніць сабой верасень. Тэмпература паветра на працягу большай часткі месяца абяцае быць на 1—2 градусы вышэйшай, чым звычайна. Асабліва адчувальна цяплей за кліматычную норму чакаецца ў першай дэкадзе кастрычніка», — расказалі ў Белгідрамеце.**

Між тым у сярэдзіне і канцы месяца магчымыя значныя паніжэнні тэмпературы. У гэты час яе сярэднія паказчыкі ад плюс 10 да плюс 12 градусаў. Увечары яна можа апусціцца да плюс 5 градусаў, таму не варта забываць пра цёплы світар.

Магчымыя суцэльныя аблокі, таму бачнасць на дарогах у ранішнія і вячэрнія гадзіны мінімальная.

Варта памятаць, што восеньскае надвор'е пераменлівае, то сонечна, то раптам наляціць моцны вецер. Удзень тэмпература можа падымацца аж да 20—23 цяпла, а ўначы — апускацца да 2 градусаў марозу.



На канец месяца выпадаюць дажджлівыя дні, магчымы снег. Колькасць сонечных гадзін складае ў сярэднім 6 гадзін 12 хвілін. Меркаваная тэмпература паветра ўдзень у канцы кастрычніка складае ўжо плюс 9 градусаў. Але ў гэты час яшчэ можа «стрэліць» некалькі дзён позняга бабінага лета.

Тэмпературны фон у гэтыя выхадныя будзе на 4—9 градусаў вышэй за кліматычную норму першай дэкады кастрычніка.

У суботу і нядзелю першага тыдня кастрычніка ў нашай краіне значна пацяплее, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У суботу ўплыў франтальнага раздзелу распаўсюдзіцца на многія рэгіёны Беларусі. Таму на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца кароткачасовыя дажджы рознай інтэнсіўнасці. Вецер будзе паўднёва-ўсходні ўначы слабы, удзень парывісты. Уначы чакаецца ад плюс 8 да 13 градусаў цяпла, удзень — плюс 13—20 градусаў, па поўдні краіны — да 22 цяпла.

Яшчэ цяплей чакаецца ў нядзелю. У гэты дзень уплыў франтальнага раздзелу спыніцца, на тэрыторыю краіны чакаецца паступленне вільготных цёплых паветраных мас з паўднёвых шырот. Будзе пераменная воблачнасць. Месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, у дзённыя гадзіны ў асобных раёнах — з навальніцамі. Сіноптыкамі прагназуецца паўднёва-ўсходні парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 8 да 15 цяпла, удзень будзе ўжо значна цяплей — 16—23 градусы вышэй за нуль, а месцамі нават да 25 цяпла. Як адзначаюць спецыялісты, такі тэмпературны фон будзе на 4—9 градусаў вышэй за кліматычную норму для гэтага перыяду.

Па папярэдніх прагнозах айчынных сіноптыкаў, «дарослае» бабіна лета чакае нас далей. Так, у пачатку наступнага тыдня атмасферны ціск падрасце, узмоцніцца і ўплыў шырокага антыцыклону з цэнтрам над сярэдняй Волгай. Толькі па захадзе краіны захаваецца ўплыў франтальнага раздзелу, дзе яшчэ чакаюцца кароткачасовыя дажджы, удзень, магчыма, з навальніцамі. Паўднёва-ўсходні і паўднёвы вецер будзе падтрымліваць у краіне анамальна цёплае надвор'е. У панядзелак і аўторак тэмпература ўначы складзе 8—15 цяпла, удзень — ад плюс 14 градусаў да 20 цяпла, па поўдні — плюс 21—23 градусы.

А вось у сераду стане крыху халадней. У гэты дзень тэрыторыя краіны трапіць у зону павышанага атмасфернага ціску, таму ў многіх раёнах краіны будзе без ападкаў, толькі па захадзе месцамі магчымыя кароткачасовыя дажджы. Вецер будзе паўднёвы ўмераны. Тэмпература паветра ўначы чакаецца ад 7 да 14 градусаў цяпла, удзень будзе камфортна і па-асенняму цёпла — плюс 13—20 вышэй за нуль.

**Сяргей КУРКАЧ.**

---

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
